ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР.

№7 (1644) | Аўторак, 23 студзеня 1962 года. | Цана 4 кап.

У ГЭТЫМ НУМАРЫ

КАМПАЗІТАРЫ РЭСПУБЛІКІ РЫХТУЮЦЦА ДА СВАЙГО З'ЕЗДА. ◆ ЭСТАФЕТА ПРЫГОЖЫХ СПРАЎ. ◆ РАЗМОВА ПА ШЧЫРАСЦІ З РАБОТНІКАМІ «САЮЗДРУКУ». ◆ УРЫВАК З КІНААПОВЕСЦІ ІВАНА ШАМЯКІНА. ◆ РЭЦЭНЗІЯ НА НОВУЮ КНІГУ. ◆ З ГІСТОРЫІ «НАШАЙ ДОЛІ».

СЕСІЯ АКАДЭМІІ НАВУК БССР

Днямі адбыўся агульны сход Акадэміі навук БССР. Ён разгледзеў пытанні: выбары прэзідэнта АН БССР, аб арганізацыі аддзялення сельскагаспадарчых навук, аб перайменаванні аддзялення біялагічных навук.

Тайным галасаваннем прэзідэнтам Акадэміі навук БССР зноў выбран член-карэспандэнт Акадэміі навук СССР, акадэмік Акадэміі навук БССР В. Ф. Купрэвіч.

Агульны сход вырашыў арганізаваць аддзяленне сельскагаспадарчых навук Акадэміі навук БССР у складзе 12 акадэмікаў і 8 членаў-карэспандэнтаў.

Выконваючым абавязкі акадэміка-сакратара аддзялення прызначан акадэмік АН БССР С. Г. Скарапанаў.

Агульны сход прыняў рашэнне аб перайменаванні аддзялення біялагічных навук у аддзяленне біялагічных і медыцынскіх навук.

У рабоце сесіі Акадэміі навук БССР прынялі ўдзел сакратар ЦК КПБ В. Ф. Шаура і загадчык аддзела навукі, ВНУ і школ ЦК КП Беларусі Н. М. Мяшкоў.

Экспазіцыі аб XXII з'ездзе КПСС

У Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі адкрылася новая экспазіцыя «XXII з'езд КПСС — з'езд будаўнікоў камунізма». На стэндах прадстаўлены брашуры з матэрыяламі з'езда, розныя фотаздымкі і дыяграмы. Афармлена схема злучэння Балтыйскага мора з Чорным, паказаны прыкладныя месцы, дзе будуць збудаваны Гродзенская і Мастоўская электрастанцыі.

Стэнды, прысвечаныя рашэнням XXII з'езда КПСС, абсталяваны таксама ў Лідскім і Слонімскім краязнаўчых музеях.

Тэма заняткаў — беларуская опера і балет

«Беларуская опера і беларускі балет». Гэтай тэме былі прысвечаны чарговыя заняткі універсітэта культуры, што рэгулярна працуе ў Мінскім палацы культуры прафсаюзаў.

«Аб развіцці беларускага операнага і балетнага мастацтва» расказаў музыказнаўца Б. Смольскі. Заслужаная артыстка БССР Р. Асіпенка, артысты М. Марозава, В. Земіраў, Г. Стэрлін выканалі арыі і песні з опер «Дзяўчына з Палесся» Я. Цікоцкага, «Марынка» Г. Пукста, «Павел Карчагін» П. Падкавырава, «У пушчах Палесся» А. Багатырова.

У занятках прыняў удзел кампазітар Г. Вагнер, які расказаў прысутным аб сваім балеце «Падстаўная нявеста» і пазнаёміў іх з новым творам — балетам «Цудоўнае святло». Г. Вагнер выканаў музычныя ўрыўкі з гэтых твораў.



Харошыя дзяўчаты на будоўлі нафтагіганта! Фота А. Васечкі (БЕЛТА).

Я. ЦІКОЦКІ, старшыня праўлення Саюза кампазітараў БССР,

І. НІСНЕВІЧ, адказны сакратар.

ДУМКІ ПРА МУЗЫЧНАЕ ЗАЎТРА

ТРЭЦЯГА ЛЮТАГА ў Мінску пачынаецца чацвёрты з'езд кампазітараў Беларусі. У праграме з'езда—прагляд оперных і балетных спектакляў, праслухоўванне сімфанічнай музыкі, твораў для Беларускага народнага аркестра, Народнага ансамбля песні і танца, харавой музыкі, музыкі для дзяцей, камерна-інструментальных і вакальных п'ес, масавых песень і эстрадных твораў.

Кампазітары Беларусі будуць рабіць справаздачу перад грамадскасцю ў канцэртных залах, клубах Мінска і Салігорска, у Доме культуры калгаса «Авангард» і ў Палацы піянераў і школьнікаў. На з'ездзе прагучаць творы вядомых беларускіх кампазітараў і музыка зусім маладых аўтараў, якія ўпершыню будуць трымаць такі адказны творчы экзамен.

Чацвёрты з'езд кампазітараў Беларусі адбудзецца пасля таго, як XXII з'езд КПСС прыняў праграму пабудовы камунізма ў нашай краіне. Цяпер, калі адкрылася новая вялікая старонка сусветнай гісторыі, калі будаўніцтва камуністычнага грамадства стала непасрэднай практычнай задачай савецкага народа, незвычайна ўзрастаюць ідэйна-выхаваўчая роля музычнага мастацтва, яго высокае прызначэнне і абавязкі, павялічваюцца патрабаванні грамадства да музыкі.

Праграма партыі заклікае нас, дзеячоў музычнага мастацтва, актыўна памагаць фарміраванню чалавека камуністычнага грамадства, ствараць музыку, якая павінна служыць крыніцай радасці і натхнення для мільёнаў людзей, выражаць іх волю, пачуцці і думкі, служыць сродкам іх ідэйнага ўзбагачэння і маральнага выхавання.

Хіба можам мы з нашымі мінулымі, часам застарэлымі, творчымі крытэрыямі, мінулым узроўнем майстэрства, кіруючыся часам вельмі абмежаванымі паняццямі аб народным і сучасным, традыцыйным і наватарскім у творчасці, аб ролі музычнай крытыкі,—ажыццявіць пастаўленую партыяй перад намі такую ганаровую, але вельмі складаную задачу? Вядома, не. Вось чаму на з'ездзе ў час творчых дыскусій і ў далейшай пасляз'ездаўскай працы саюза намаганні кампазітараў і музыказнаўцаў павінны быць накіраваны на актывізацыю творчасці, высокую яе мастацкую вартасць.

Мы павінны па-дзелавому павесці гаворку аб сучаснай музыцы, якая будзе мець права на творчае жыццё і ў далейшым, стане неадрыўнай часткай вялікай музыкі камунізма.

На працягу многіх год заўважаецца значнае адставанне беларускіх кампазітараў у авалоданні майстэрствам. Мы хочам адразу ж сказаць, што яшчэ многія нашы кампазітары і музыказнаўцы глыбока памыляюцца, калі разумеюць майстэрства толькі як тэхналогію твора, як уменне карыстацца прыёмамі, сродкамі. Не, майстэрства—не тэхналогія, нават калі яно і самае дасканалае. Толькі той—кампазітар-мастак, хто ўмее з натхнёнай асэнсаванасцю і бездакорнай логікай увасабленне паказаць у сваім творы наша жыццё; хто здольны ўбачыць у жыцці самае важнае і, падпарадкоўваючыся патрабаванням сучаснасці, яскрава адлюстраваць гэтае самае важнае ў сваім творы. Тады ў нашай музыцы не будзе ілжэканфліктаў, дробнатэмнасці, псеўданаватарства. Толькі пры такім разуменні майстэрства мастак становіцца вольным у сваёй творчасці, успрымае свабоду гэтай творчасці, як асэнсаваную неабходнасць пісаць для свайго народа тое, што народу патрэбна, і так, як па патрэбна. З-за адсутнасці сапраўднага майстэрства ў нас доўгія гады няма буйных, манументальных па ідэях і мастацкаму ўвасабленню оперных твораў. Ніякія спасылкі на адсутнасць лібрэта не могуць апраўдаць гэта ненармальнае становішча. Асноўнай заганай новых опер з'яўляецца слабая, а часам бездапаможная музычная драматургія. Не трэба забываць, што ў оперным творы ўсе асноўныя драматургічныя вузлы, кульмінацыі, вобразныя характарыстыкі, тэма, падыход да яе вырашэння і г. д. павінны падначальвацца кампазітару. Кампазітары павінны ведаць, што яны не стваральнікі музыкі да лібрэта, а аўтары твораў, дзе музыка з'яўляецца першаасновай. І калі б нашы кампазітары валодалі майстэрствам у аб'ёме, неабходным для напісання паўнацэннай па ідэі, эвалюючай па эмацыянальнаму заряду оперы, дык і праблема сучаснага зместу вырашалася б значна лягчэй. Тут на дапамогу, відаць, прыйшла б беларуская савецкая літаратура з яе багаццем тэм і вобразаў.

Праблема авалодання майстэрствам мае выключнае значэнне і для сімфанічнай музыкі. Нельга забываць, што сімфанізм—гэта музычная драматургія, складанасць успрымання якой слухачамі павялічваецца з-за адсутнасці слова.

Не можа пакінуць цэласнае ўражанне сімфанічны твор, у якім няма пераканаўчай логікі развіцця драматычнага матэрыялу, няма арганічнай сувязі паміж асобнымі часткамі цыкла, якім з'яўляецца, напрыклад, сімфонія. Не ўразіць слухачоў і сімфанічны твор, у якім няма абагульняючага фіналу, няма лагічнага выводу з усяго «сказанага» раней. Няма сімфанічнага твора без вынаходлівасці і яркай аркестравай мовы. А колькі яшчэ ў нас такой сімфанічнай музыкі, дзе яркі, цікавы па задуме змест вылліваецца ў выпадковую форму. Са знешняга боку тут быццам усё ў парадку: ёсць галоўная і пабочная партыя і сувязь паміж імі, а пасля ўступу і экспазіцыі ідзе распрацоўка музычнага матэрыялу. Але ж форма ўзята «напракат» з твора з зусім іншым ідэйна-вобразным зместам. І ад задумы аўтара ў такім разе застаецца толькі сама назва на лісце партытуры.

Праблема майстэрства непарыўна звязана з такімі разуменнямі, як пачуццё сучаснага, як наватарства і традыцыі, яснасць і прастата, спрашчэнства і прымітывізм.

Які музычны твор трэба лічыць сучасным? Нам здаецца такі, які хвалюе ўсіх (дададзім: хто любіць жыццё і музыку) сваёй надзённасцю, імкненнем зазірнуць у заўтрашні дзень. Такі твор павінен мець грамадска значную тэму, выказаную ў эмацыянальна напоўненых музычных вобразах. Тут узнікае пытанне аб сучаснай музычнай мове. Кампазітар павінен умець падслухаць у свайго народа тыя новыя інтанацыі, якія, безумоўна, нараджаюцца ў кожную эпоху, тым больш, у нашу.

Кампазітар ніколі не павінен забываць, што ўзбагачэнне гармоній, аркестравых фарбаў, пошукі формы з'яўляюцца сродкам, але не мэтай. І тады новае будзе нараджацца як заканамерны працэс, спалучаючы ў сабе глыбіню ідэі і прыгажосць формы.

Яснаму па думцы і сапраўды прыгожаму твору глыбока варожыя прымітывізм і штучнае аздабленне. Самі па сабе вельмі простыя тэмы, але такія, што не маюць належнага развіцця, не могуць раскрыць пачуцці, псіхічны свет людзей, не могуць раскрыць тое, што з'яўляецца агульначалавечай тэмай усяго музычнага мастацтва. Такім чынам не аб прастаце тэм павінна ісці гутарка, калі мы гаворым пра ідэйную глыбіню і мастацкую дасканаласць твора. Прымітывізм псуе творчасць не менш, чым надуманая ўскладнёнасць. Тое ж самае трэба сказаць і аб упрыгожванні. І тут трэба звярнуць увагу на выкарыстанне кампазітарамі фальклорнага матэрыялу.

Самыя цудоўныя фальклорныя тэмы, нават любімыя і вядомыя нам з дзіцячых год, самі па сабе не могуць зрабіць твор прыгожым і яркім, калі за імі не адчуваецца дапытлівая кампазітарская думка. А колькі ў нас яшчэ выпадкаў, калі аўтар спадзяецца, што народная цытата нават пры адсутнасці кампазітарскай думкі можа ўдыхнуць жыццё ў прыгладжаны аркестравы твор, які чамусьці называецца сімфоніяй, інструментальным канцэртам або паэмай. Як тут не ўспомніць цудоўныя словы В. Бялінскага, што народнасць—гэта не сарафаны, а дух народны.

Авалодваючы майстэрствам, нашы кампазітары павінны таксама адмовіцца ад спажывецкіх адносін да выкарыстання нацыянальнага музычнага фальклору, навучыцца раўняцца на тыя «маякі»—вяршыні савецкай музыкі, якія ўжо заваяваны многанацыянальным калектывам савецкіх кампазітараў. У наш час, у нашай краіне не можа і не павінна быць нацыянальнай абмежаванасці. Мы ніколі не павінны забываць аб агульнасці нашых сацыялістычных культур, аб узаемапранікненні, аб узаемаўплыве адной культуры на другую. Мы павінны таксама, крытычна ацэньваючы і творча пераасэнсоўваючы, вывучаць усё лепшае, што стварылі перадавыя мастакі Захаду.

Павышэнне агульнага ўзроўню творчасці беларускіх кампазітараў недарыўна ад развіцця крытычнай музыказнаўчай думкі. Крытык-музыказнаўца, таксама як і кампазітар, павінен умець вызначыць галоўнае ў развіцці нашай музычнай культуры. На жаль, нашы музыказнаўцы не здольны яшчэ паставіць патрэбную праблему, абагуліць у стройную сістэму назіранні над жыццём і творчасцю. Яны наогул вельмі мала пішуць. Многім артыкулам нашых музыказнаўцаў нестае публіцыстычнай вастрыні, вобразнасці мовы, іх цяжка зразумець. Яшчэ вельмі часта сапраўдны аналіз таго ці іншага твора падмяняюць уяўна навуковымі размовамі.

Стварэнне ў музычным асяроддзі здаровай творчай атмасферы ў многім залежыць ад дзейнасці музычных крытыкаў. Яшчэ вельмі часта даводзіцца назіраць, як сяброўская крытыка падмяняецца маўчаннем. Некаторыя музыказнаўцы, ды і кампазітары, не знаходзяць у сябе здольнасцей глыбока творча прааналізаваць музыку сваіх таварышаў.

Нельга ўтаіць і тое, што, як і нашы некаторыя кампазітары, музыказнаўцы яшчэ вельмі мала вывучаюць жыццё, не цікавяцца літаратурай, не ведаюць тых істотных змен, якія адбываюцца ў навуцы, у ідэйна-эстэтычным выхаванні савецкіх людзей.

Некалькі слоў аб сувязі кампазітарскай арганізацыі з жыццём народа. Кожны кампазітар і музыказнаўца павінен удзельнічаць у эстэтычным выхаванні народа, а не быць стаpоннім, абыякавым сведкам абмеркавання грамадскасцю яго твораў. Кампазітар павінен імкнуцца правяраць свае творы ў масавай аўдыторыі.

Як рыхтуюцца кампазітарскія і музычныя кадры ў нашай рэспубліцы? На жаль, наша кампазітарская арганізацыя вельмі марудна расце колькасна. Прычына гэтага ў тым, што музычныя навучальныя ўстановы да гэтага часу дрэнна камплектуюцца студэнтамі і таму Саюз кампазітараў не мае неабходнага папаўнення. Гэта тое, што перашкаджае папаўненню нашай арганізацыі кампазітарскай і музыказнаўчай моладдзю. Але праблема кадраў вырашаецца не толькі колькасцю, але і якасцю. Нам здаецца, што ў справе выхавання моладзі шмат чаго трэба перагледзець. Неабходна, каб маладыя кампазітары і музыказнаўцы мелі не толькі музычна-тэарэтычную і спецыяльную падрыхтоўку, але, каб яны адчувалі сябе мастакамі і грамадскімі дзеячамі. Марксісцка-ленінская падрыхтоўка маладых кампазітараў і музыказнаўцаў у кансерваторыі павінна дапамагаць ім крытычна адносіцца да ўсіх тых праяў загніваючай буржуазнай культуры, якія часам шкодна ўплываюць на ідэйна-эстэтычныя густы моладзі.

Маладыя кампазітары і музыказнаўцы часам не разумеюць традыцый у развіцці музычнай культуры, нігілістычна адносяцца да лепшых здабыткаў мінулага. Яны не ўмеюць асэнсаваць сучаснасць і адлюстраваць яе ў сваёй творчасці. Некаторыя маладыя кампазітары недаацэньваюць і не разумеюць значэння песні ў развіцці свайго майстэрства. Трэба, каб кожны малады кампазітар працаваў у жанры кантаты, оперы, якія найбольш даступны шырокім масам слухачоў. Неабходна, каб маладыя музыказнаўцы маглі чытаць лекцыі, пісаць артыкулы аб музычным мастацтве, каб яны навучыліся сумленна, не зважаючы на аўтарытэты, выказваць сваю думку.

Вялікая праца чакае ўсіх нас на шляху вырашэння асноўнай задачы, якую паставіла партыя перад савецкім мастацтвам—зрабіць мастацтва магутным сродкам ідэйнага ўзбагачэння і маральнага выхавання савецкіх людзей—будаўнікоў камуністычнага грамадства.

На агітпункце ў будынку бібліятэкі мінскіх аўтамабілебудаўнікоў, заўсёды многалюдна. Да паслуг наведвальнікаў — свежыя газеты, часопісы, разнастайная літаратура аб савецкай выбарчай сістэме. Агітатары кансультуюць выбаршчыкаў. На здымку вы бачыце агітатара, старшага майстра цэха шасі Леаніда Семяновіча ў гутарцы з токарам Розай Беспаясна і тэхнолагам Леанідам Васільевым.

Фота Ул. КРУКА.

Анатоль ВЯРЦІНСКІ

Стронцый

Стронцый-90—радыёактыўны ізатоп. Солі ж звычайнага стронцыю ўжываюцца ў піратэхніцы.

Слова гэтае сугучнае
са словам «сонца».
Ды іх рыфмаваць ці будзеш цяпер? Наўрад.
Разумееце, гэта слова «стронцый».
(Паспрабуй пастаў яго
з сонцам у рад.)
Так, так, гэта той самы стронцый,
Прад якім цямнеюць
і порах, і свінец,
Аб якім на кожнай газетнай старонцы
Папярэджваюць:
«Стронцый — гэта канец».
Скажам, выбухне бомба вадародная
дзесьці.
І з месца таго,
адразу ва ўсе бакі,
Пачнецца стронцыю
смертаноснае шэсце,
Якое не спыняць ні людзі, ні іх багі.
Ён будзе ісці і з ветрам
і супраць ветра,
Як ні адзін мор
ніколі яшчэ не ішоў.
Ён будзе атручваць усё —
і хлеб, і ваду, і паветра,
Ён будзе атручваць нас
і нашых малышоў.
Дзеці слабей за нас,
ім хопіць меншай дозы.
Ручкі працягваць
будуць да нас дарма,
Не ведаючы,
што тут не памогуць слёзы,
Не верачы,
што тут паратунку няма.
Будзе няўцям малым,
што мы ім не абаронцы,
Хаця засланялі дагэтуль
ад самых розных бед,
Што нас саміх
вось-вось даканае стронцый
І ўслед за дзецьмі
адправіць на той свет.
Калі ж нас там
пацягнуць у пекла якія дурні,
Спрачацца не будзем,
з усмешкай скажам: «Пайшлі».
І здасца нам пекла
мірнаю смалакурняй
Перад тым, што мы чулі і бачылі на зямлі...
Ды хопіць, бадай, каркаць.
Я чую словы папроку.
Я чую голас магутны і звонкі,
як майскі гром:
— Даволі з нас паніхід!
Вайна—назад! І ні кроку!
Далоў вайну!
Бо вайна — ўзаемны пагром!
А голас з будучага
гучыць шчасліва і ўрачыста:
— Бомбы скінуты ў мора,
гарматы пайшлі на злом.
Знішчана самае страшнае
на зямлі злачынства,
Пакончана з самым вялікім
на свеце злом.
— А што са стронцыем!
Гразою быцця чалавечага!
— А вы галаву узніміце,
вы паглядзіце уверх!
Вы бачыце, цэлае неба
агнямі расквечана!
Вы бачыце гэты,
нябачаны 'шчэ феерверк!
Ён асвятляе,
напэўна, не менш як з паўсвета.
Гэта майстры піратэхнікі
розных краін
Радуюцца разам,
што на вайну накладзена вета,
Што на небе не будзе хмар,
а на зямлі — руін.
Вы толькі гляньце!
Не піратэхнікі — магі!
Заўважце, расшчодрыліся
асабліва майстры
На чырвань і пурпур, —
як вяпізныя ружы і макі,
Палыхаюць-квітнеюць
паветраныя кастры.
Яны — бы асколкі
самога барвовага сонца.
І колер гэты
надае святочным агням
Не што іншае,
як ператвораны стронцый,
Радня таго стронцыю,
што пагражаў нам...
Ірвуцца, пырскаюць
агнямі ракеты ў паветры.
Ґ гледзячы радасна
на гэты дзівосны парад,
«Сонца» і «стронцый»
рыфмуюць смела паэты.
«Стронцый» і «сонца»
ставяць у адзін рад.

На чарговай серадзе

Напярэдадні з'езда беларускіх кампазітараў асабліва часта адбываюцца музычныя серады.

На чарговай серадзе на мінулым тыдні былі абмеркаваны новыя харавыя і камерна-інструментальныя творы кампазітараў рэспублікі. Хор Беларускага радыё і тэлебачання (дырыжор І. Кліёнскі) праспяваў тры масавыя песні на словы А. Дзеружынскага—«Слава розуму чалавека» Э. Тырманд, «Герой-касманаўт» І. Ронькіна, «Партыі слава ў вяках» М. Шнейдэрмана, а таксама харавы акапэльны твор І. Маціна «Слава табе, работа!». Кампазітары і музыказнаўцы, праслухаўшы гэтыя героіка-патрыятычныя творы, адзначылі рад станоўчых якасцей іх. Абмяркоўваючы кожную песню паасобку, А. Ракава, І. Нісневіч, Р. Бутвілоўскі, Я. Цікоцкі, Ю. Семяняка зрабілі аўтарам канкрэтныя заўвагі.

У песні Э. Тырманд «Слава розуму чалавека» адчуваецца неадпаведнасць паміж яе запевам і прыпевам. Шырокі, прыўзняты запеў гучыць ярка і велічна і добра ўспрымаецца слухачом. А ў прыпеве, дзе павінен быць падведзены лагічны вынік усяму раней сказанаму, музычны матэрыял нечакана пачынае драбнець, у ім паяўляецца непатрэбная эстрадная інтымнасць. Адбываецца гэта таму, як гаварылі прамоўцы, што ў сярэдзіне прыпеву аўтар рэзка змяніў мадуляцыйны план.

Напісаны ў традыцыях лепшых песень І. Дунаеўскага, харавы твор І. Ронькіна вабіць яснай мелодыяй і рытмічнай разнастайнасцю. Але аўтар не зусім удала напісаў партыю для саліста, таму высокія жаночыя галасы ў час спявання яго зусім заглушаюць.

Манатоннай і наўмысна афіцыйнай выглядае песня М. Шнейдэрмана. Магчыма, такое ўражанне ў слухачоў склалася яшчэ і таму, што гэтая песня выконвалася (як і ўсе іншыя) няпоўным складам хору радыё.

Спадабаўся акапэльны хор І. Маціна «Слава табе, работа!» Усе адзначылі, што гэты кампазітар робіць у апошні час некаторыя творчыя поспехі.

З камерна-інструментальных твораў на серадзе былі паказаны і абмеркаваны Саната для кларнета з фартэпіяна П. Падкавырава і «Жарт» Я. Дзягцярыка для таго ж складу інструментаў. Гэтыя творы выканалі саліст Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра БССР Я. Лосеў і піяністка радыё Т. Міянсарава.

Многія прамоўцы пагадзіліся на тым, што інструментальны твор П. Падкавырава — зусім не саната, а хутчэй за ўсё маленькая сюіта, якая мае тры асобныя самастойныя часткі, не звязаныя паміж сабой. З такой думкай былі не згодны кампазітар Я. Цікоцкі і кларнетыст Я. Лосеў. Цікоцкі, напрыклад, лічыць твор П. Падкавырава ярка сучасным па накіраванасці музыкі, а сам выканаўца задаволены тым, што санату лёгка выконваць, і яна можа быць выкарыстана ў якасці педагагічнага і канцэртнага рэпертуару. У сувязі з гэтым Я. Лосеў узняў пытанне аб хутчэйшым выданні санаты П. Падкавырава і твораў гэтага жанра М. Аладава і А. Туранкова.

Чалавеку гаворацъ ДЗЯКУЙ

СЛУЖУ САВЕЦКАМУ НАРОДУ!

Віктар расплюшчыў вочы. Усё вакол бялюткае-бялюткае: і сцены, і ложкі, і дзяўчына, што нахілілася над ім. Няўжо ён у бальніцы?

На суседнім ложку застагнаў хворы. Дзяўчына ў белым заспяшалася да яго. Віктар таксама хацеў зірнуць на суседа, ды рэзкія болі ў плячы і баку не дазволілі павярнуць галаву. У вачах выбухнуў сноп вогненных іскраў. Віктар зноў страціў прытомнасць.

Апрытомнеў толькі пад раніцу. Заўважыў букет кветак, што стаяў на тумбачцы.

— Ад каго?—спытаў у медсястры.

— Ад Тацяны Пятроўны, — усміхаючыся, сказала тая.

«Хто такая Тацяна Пятроўна?». Здаецца, сярод яго знаёмых не было жанчыны з такім імем.

Ці можа... Віктар, як праз сон, успомніў, што было два дні назад. У той вечар ён, як звычайна, патруляваў па вызначаным маршруце. За час дзяжурства не здарылася ніякіх незвычайных выпадкаў. На пасту яго змяніў старшына міліцыі. І ён спакойна пайшоў дамоў.

Цямнела. Віктар раптам пачуў прарэзлівы крык жанчыны:

— Памажыце!

Сержант пабег на крык. Дабег. Убачыў жанчыну, спалоханыя вочы якой поўныя слёз. І побач — перакошаныя ад злосці твары злачынцаў — яны дамагаліся, каб жанчына зняла і аддала ім сваё зімовае паліто.

Нямала ён, сержант міліцыі, за час сваёй службы затрымаў небяспечных злачынцаў. У гэтым годзе даў слова зрабіць свой пост пастом узорнага грамадскага парадку. Затрымліваў і адзін на адзін, і адзін супраць двух. А тут адразу паядынак з трыма. Жанчыну ў разлік прымаць нельга: тая з перапалоху слова вымавіць не можа.

Мажліва які-небудзь абыякавы служака разважыў бы так: служба закончана, час не рабочы, пост чужы, ці не лепш абысці бандытаў бокам і далажыць дзяжурнаму — няхай прымае меры. Але ў Віктара ўсе пасты ў горадзе не чужыя — свае. Заўсёды — і ў час дзяжурства, і ў час адпачынку—ён на службе. І Віктар, не раздумваючы, пачаў адзінаборства з тоўпам бандытамі.

Пякуча саданула вострае лязо ў Віктарава пляво, у бок. Але, падаючы, ён не выпусціў заломленай рукі аднаго з бандытаў, і нават здолеў дастаць з кішэні свісток. Трывожны свісток пачуў на суседнім пасту старшына міліцыі.

Малайчына —старшына, спрытна зваліў з ног астатніх бандытаў, якія ўжо намерыліся ўцякаць. Далей Віктар не памятае нічога. Восем нажавых ран нанеслі яму бандыты...

Міліцэйскі свісток. Ён і цяпер чуецца Віктару. Не, гэта не свісток, гэта чырыкаюць на падаконніку вераб'і. Краем вока Віктар бачыць іх ускудлачаныя галовы.

Медсястра дае яму праглынуць нейкую прытарна-салодкую мікстуру. Сон зноў скоўвае Віктару павекі.

...Толькі праз месяц сержанта міліцыі Віктара Маёрава выпісалі з бальніцы. Ідзе Віктар прыгожымі вуліцамі роднага горада. Ідзе не адзін: сустракаць яго прыйшлі сябры па рабоце. Ярка гараць лямпачкі навагодніх ёлак, кружацца ў паветры лёгкія сняжынкі.

А ў аддзяленні міліцыі яго чакала віншавальная тэлеграма ад Тацяны Пятроўны, той жанчыны, якую ён выратаваў ад злачынцаў. Разам з тэлеграмай прыйшоў і загад Міністэрства ўнутраных спраў аб узнагароджанні яго нагрудным значком «Выдатнік міліцыі».

— Служу савецкаму народу! — сказаў Віктар Маёраў, калі начальнік аддзялення павіншаваў яго з ганаровым званнем.

А. БЕЛАВУС.

Гродна.

ЭСТАФЕТА ПРЫГОЖЫХ СПРАЎ

Народныя тэатры, універсітэты культуры, грамадскія бібліятэкі — хіба мы ведалі ўсё гэта год пяць ці шэсць назад? Цяпер жа яны атрымалі шырокае распаўсюджанне. Гонар і слава людзям, якія былі піянерамі гэтых прыгожых спраў! Іх творчая думка, энтузіязм памагаюць грамадству крочыць да светлазорнай будучыні шляхам, вызначаным велічнай Праграмай Камуністычнай партыі.

З сённяшняга нумара наша газета пачынае «Эстафету прыгожых спраў». Маршрут эстафеты — творчыя калектывы, новабудоўлі і прадпрыемствы, калгасы і навучальныя ўстановы, кватэры і сем'і простых савецкіх людзей. Кожны этап яе будзе паведамляць аб прыгожых справах у галіне будаўніцтва камуністычнай культуры, у выхаванні маралі новага чалавека.

Газета звяртаецца да чытачоў: прапаноўвайце нам цікавыя этапы, па якіх вы лічыце неабходным, каб прайшла эстафета.

У нас узнікла пытанне: адкуль пачынаць маршрут? Напэўна, у кожным савецкім калектыве сёння нараджаецца нешта новае, прыгожае, што мае перспектыву. Сапраўды, адкуль пачынаць?

І мы рашылі: пачнём без выбару. Наш карэспандэнт зайшоў у Дзяржаўны рускі драматычны тэатр імя Горкага. Тут яму паведамілі: вось ужо трэці год калектыў шэфствуе над самадзейным тэатрам-студыяй «Маяк». У «Маяку» людзі розных працоўных прафесій навучаюцца драматычнаму майстэрству. Кіруе тэатральнай студыяй народны артыст рэспублікі Р. А. Качаткоў. Хіба ж гэты факт не варты пераймання?

ПРОМНІ „МАЯКА"

Хто бываў за кулісамі Тэатра імя М. Горкага на абмеркаваннях спектакляў, на пасяджэннях мастацкага савета і сходах, той чуў неаднойчы незадаволенасць у выступленнях Рыгора Аляксеевіча Качаткова:

— Мы вельмі мала, у нейкай сотай частцы выкарыстоўваем цудадзейную сілу тэатра. Тэатр — гэта нешта невымяральна больш велічнае, чым нашы спектаклі.

— Успомніце словы буйнейшага майстра сцэны Аляксея Папова. Памятаеце, ён гаварыў: таварышы артысты, як вам не сорам. У зале дваццаць чалавек зарагочуць, а вы ўжо і рады, пнецеся, абы болей смеху, і забываецеся, што ў тэатры акрамя тых дваццаці, сядзяць яшчэ чалавек пяцьсот або тысяча, што гэтыя людзі прыйшлі не рагатаць.

— Усе мы гаворым: «Тэатр — калектыўны творца», «Тэатр аднадумцаў»... Ці не сцёрліся гэтыя словы ад вельмі частага ўжывання, ці не нагадваюць часам яны ў нашых вуснах старыя пабляклыя медзякі...

Ад Р. Качаткова, больш чым ад каго іншага, пападае звычайна і рэжысёру чарговай прэм'еры і вядучым выканаўцам, і мастаку, і аўтару. Не вельмі прыемна слухаць такое, праўда? А ў тэатры слухаюць і заўсёды з павагай чакаюць яго прамовы. Нават, бадай, і прамовамі гэта нельга лічыць, бо ў артыста ніколі няма загадзя падрыхтаваных тэзісаў. Ён спрачаецца, сварыцца, пераконвае, кліча, выказвае незадаволенасць як асабістую крыўду. У словах яго — не звяга, не імкненне закрэсліць агульную працу, а шчыры клопат і грамадзянская патрабавальнасць. Яны вынікаюць з вялікай любві да справы, якой прысвечана жыццё.

Аднойчы ў верасні 1959 года Рыгор Аляксеевіч прапанаваў стварыць своеасаблівы спадарожнік тэатра — рабочую студыю.

— Наша студыя не павінна быць навучальнай установай. Перш за ўсё яе мэта—выхоўваць людзей высокай культуры. Мастацтва тэатра павінна стаць у студыі не самамэтай, а сродкам выхавання. Мы гаворым аб калектыўнай спецыфіцы нашай прафесіі. Калектыў у тэатры — гэта не толькі вытворчыя ўмовы нашай працы, але сіла, якая павінна рабіць з нас сапраўдных людзей свайго часу. Арганізаваўшы такую студыю, мы зробім двойчы карысную справу — і сабе, і людзям, якія прыйдуць да нас.

Прапанову ў тэатры ўхвалілі. Людзі адчулі ў ёй штосьці прыгожае, новае. З'явіўся загад дырэкцыі, у якім была афіцыяльна зацверджана камісія па адбору студыйцаў. У газетах і па радыё паведамілі аб прыёме.

Ніхто, пэўна, не думаў, што будзе такі наплыў: каля дзвюх тысяч — з розных заводаў і прадпрыемстваў, нават з раёнаў і іншых гарадоў. Давялося стварыць не адну, а цэлых пяць камісій, якія два дні бесперапынна працавалі ў розных рэпетыцыйных пакоях, на сцэне і ў фае. З дзвюх тысяч адабралі трыццаць восем чалавек.

— Да нас прыходзіла шмат былых прафесіяналаў-артыстаў, — успамінае Рыгор Аляксеевіч, — былі здольныя, з пэўным вопытам гурткоўцы, імёны якіх папулярныя сярод сталічных аматараў самадзейнасці. Мы не прымалі ні няўдалых прафесіяналаў, ні самадзейных «первачоў». Мы выбіралі сапраўдных аматараў — не з тых, хто любіць выступаць, а з тых, у каго ёсць любоў да тэатра як да грамадскай з'явы.

І вось мінула амаль два з палавінай гады. Днямі на сцэне тэатра адбылася прэм'ера студыі — «Ягор Булычоў і іншыя» М. Горкага (пастаноўка Р. Качаткова і засл. арт. БССР М. Кузьменка). У цэнтральнай ролі — мастацкі кіраўнік Р. Качаткоў. Астатнія ролі выконваюць студыйцы.

Мы бачылі не так даўно спектаклі Ашмянскага і Аршанскага народных тэатраў з удзелам вядучых майстроў купалаўскай сцэны. Гэта была цікавая з'ява ў жыцці мастацтва. Нікольки не прыніжаючы яе, нельга, аднак, было не заўважыць зусім натуральны разрыў у якасці і манеры выканання паміж аматарамі і артыстамі. Сцэнічнага ансамбля тут не было і не магло быць.

У пастаноўцы «Маяка» з удзелам Р. Качаткова мы ўбачылі штосьці такое, чаго нават нельга пакуль што вызначыць дакладнымі словамі. Гэта, бадай што, новая форма мастацтва, якое не з'яўляецца прафесіянальным, і ў той жа час яго не назавеш самадзейнасцю. Мы б пакрывілі душой, сказаўшы, што студыйцы дасягнулі ўзроўню майстэрства, якім валодае іх кіраўнік. Аднак чаму ж у спектаклі не адчуваеш розніцы паміж імі? І нават забываешся на тое, што перад табой на сцэне артыст і аматары...

Тут ёсць сапраўдны ансамбль. Ён вынікае з думкі горкаўскай п'есы. Выканаўцы аднолькава пранікліся ўсімі яе адценнямі. Ніякай штучнасці, ніводнага нават намёку на вонкавую тэатральную эфектнасць. Усё абумоўлена самай глыбокай, кроўнай неабходнасцю жыцця кожнага з персанажаў. На сцэне само жыццё. Адбываецца тое, аб чым пісаў Горкі: «Мастак, наглядаючы ўнутраны свет людзей — псіхіку — паказвае чалавеку веліч і нізасць яго, сілу яго розуму і сілу яго звярыных якасцей».

Не давайце клопату сваёй памяці. Такой сцэны — спрэчкі Булычова з Цяціным у п'есе няма. Мастацкі кіраўнік Р. Качаткоў, забыўшыся на грым, у антракце выказвае студыйцам сваю думку, як прайшла чарговая дзея спектакля.

Нас вельмі ўсхвалявала пытанне: як дасягнулі студыйцы такіх вялікіх вынікаў. Вось што нам расказалі.

На працягу двух гадоў амаль штодзённа ў студыі адбываліся заняткі па майстэрству акцёра, сцэнічнай мове, пластыцы. Але самай каштоўнай справай былі сустрэчы-гутаркі аб мастацтве. Студыйцы запрашалі да сябе артыстаў і рэжысёраў (мясцовых і з гастрольных калектываў), студэнтаў мастацкіх устаноў Масквы, Ленінграда, Мінска. Заняткі па майстэрству акцёра тут набылі таксама форму гутарак. Чыталася п'еса. Потым ішла размова: пра час, адлюстраваны аўтарам, пра жыццёвыя з'явы, пра характары персанажаў, іх імкненні і ўчынкі. Узнікалі спрэчкі. Даводзячы тую ці іншую думку, Р. Качаткоў непрыкметна пераходзіў ад лагічных доказаў да вобразнага паказу. Гэты пераход можна назваць педагагічным прыёмам. Аднак у практыцы ён ніколі не бывае загадзя падрыхтаваным: кіраўнік разам са студыйцамі ўдзельнічаў у спрэчках і карыстаўся сцэнічным паказам толькі тады, калі бачыў, што іншыя сродкі пераканання вычарпаны. Хтосьці са студыйцаў станавіўся часовым партнёрам артыста па сцэне, якая выклікала спрэчку. Потым уцягваліся іншыя. Так узнікаў эцюд. Размова непрыкметна ператваралася ў рэпетыцыю. Але студыйцы не рэпеціравалі ролі—яны працягвалі тую ж спрэчку, карыстаючыся ўжо не сваімі словамі, а толькі аўтарскім тэкстам. Калі гэты своеасаблівы дыспут прыводзіў да згоды ўсіх яго ўдзельнікаў, — сам па сабе атрымліваўся спектакль. Так нарадзіліся «Незнаёмыя людзі» Л. Усцінава і «Сентыментальны вальс» В. Літоўскай. А вось «Няроўны бой» В. Розава так і не завяршыўся агульным разуменнем, і ад яго пастаноўкі студыя, пасля доўгай працы, адмовілася.

— Не думайце, што мы пацярпелі паражэнне ў «Няроўным баі», — жартуе Р. Качаткоў. — Гэта таксама была перамога: навошта патрэбен спектакль без адзінай ідэі?

Можна уявіць, што вопытны майстра мог бы, нягледзячы на супярэчнасці, паставіць спектакль, і здолеў бы ў ім правесці аўтарскую задуму. Для дасягнення мэты можна было б выкарыстаць і дысцыпліну студыйцаў і свой аўтарытэт і, як гэта робяць іншыя рэжысёры, акцэнтаваць ідэю пастановачнымі сродкамі — сцэнічным рытмам, музыкай, святлом, афармленнем.

— Але ўсё гэта — не наша задача. Мы выхоўваем людзей Мы верым, што сіла ўнутранага пераканання мацнейшая за ўсе тэатральныя эфекты.

У гэтых словах вялікі змест. Не будзем перавялічваць: яны не новыя і не адкрытыя ўпершыню ў студыі «Маяк». Але для таго, каб яны сталі прынцыпам творчага (і асабліва вытворчага) жыцця калектыву, не ў кожным тэатры ёсць людзі і ўмовы.

— У нас ёсць людзі, якія пакуль што ні разу не выходзілі на сцэну, — расказваюць студыйцы. — Ёсць і такія, хто, пэўна, ніколі і не адчуе подых глядзельнай залы. Але мы ад іх не адмаўляемся. І яны нікуды ад нас не пойдуць. Яны жывуць з намі адзіным жыццём — жыццём тэатра. Заняткі студыі ўзбагачаюць іх, як і нас, робяць жыццё больш змястоўным, цікавым.

Часам на заняткі «Маяка» прыходзяць гурткоўцы з іншых калектываў. І яны шчыра зайздросцяць атмасферы, якая панае ў гэтай студыі.

Рыгор Аляксеевіч марыць аб новых формах работы. Ён хоча ў бліжэйшы час наладзіць сістэматычныя сустрэчы з рабочымі, вучонымі, мастакамі, пісьменнікамі.

— Калі мы здолеем усё гэта арганізаваць, праз нейкі час мы саміх сябе не пазнаем. У гэтым — невычэрпная крыніца нашага росту. Не трэба парадных сустрэч. Патрэбны сяброўскія дзелавыя размовы. Толькі яны ўзбагацяць нас глыбокім разуменнем спраў, якімі жыве наш сучаснік — перадавы чалавек новага грамадства.

* * *

М. Горкі пісаў: «Тры чалавекі ствараюць культуру: вучоны, мастак і рабочы. Перадавы рабочы клас, якім з'яўляецца наш, савецкі, павінен ведаць, што няма працы, якая не мела б культурнага значэння, што чым мацнейшая любоў да працы, тым вышэйшая культура і што да поўнай, усеагульнай перамогі над старым светам ён прыйдзе хутчэй, калі добра зразумее рашаючае значэнне навукі, мастацтва, працы».

На прыкладзе «Маяка» можна пераканацца, што думкі М. Горкага аб культуры, выказаныя амаль трыццаць пяць год назад, сёння сталі ў нас нормай жыцця. У студыі сярод яе ўдзельнікаў — шмат рабочых: слесары, токары, капіроўшчыцы і мантажнікі. Разам з імі — малады вучоны, аспірант Беларускай акадэміі навук і — мастак, народны артыст рэспублікі. Пра кожнага з іх можна шмат расказаць. Але сёння мы абмежавалі нашу размову агульнай характарыстыкай высакароднай справы, якую робяць гэтыя людзі.

Георгій КОЛАС.

ПІСЬМЫ з каментарыямі

ХТО ЎСЁ Ж ВІНАВАТЫ?

«Ці знойдзецца такі чалавек, які не любіў бы кнігу, газету, часопіс, не адчуваў у іх патрэбы? Напэўна, не. Наш сучаснік з нецярплівасцю чакае паяўлення на свет і новай кнігі, і свежага нумара часопіса, — піша ў рэдакцыю чытач нашай газеты Іван Стадольнік. — Але паспрабуйце купіць у Полацку свежы нумар «Полымя», «Маладосці» ці газеты «Літаратура і мастацтва». Кіяскёр паглядзіць на вас як на нейкага дзівака, а пасля абыякава скажа: «У нас з роду такіх не было». І дарэмныя будуць вашы просьбы, нарэшце, перакананні, што вам надзвычай патрэбен, скажам, нумар «Полымя», — нічога не паможа. Вы пачуеце нязменны, стандартны адказ: «Няма».

Дык вось я і прапаную: няхай бы полацкія кіяскёры «Саюздруку» напісалі на відным месцы аб'явы, што яны рэспубліканскімі літаратурна-мастацкімі часопісамі і газетай «ЛіМ» не гандлююць. Было б і ім спакайней, і пакупнік дарэмна не турбаваў бы гэтых бяздушных людзей, якія з такой лёгкасцю адмаўляюць чытачу ў рэчах, далёка не дэфіцытных».

Падобныя сігналы рэдакцыя атрымлівала з Мазыра, Маладзечна, Івянца, Брэста, Крывічоў, Крупак. І вось карэспандэнт газеты гутарыць з намеснікам начальніка Упраўлення па распаўсюджванню друку Міністэрства сувязі БССР тав. Ул. Ігнатовічам і начальнікам Беларускай рознічнай канторы «Саюздрук» тав. І. Лукашэвічам.

— Справы ў нас ужо не такія благія, як вам здаецца, — бадзёра гаворыць тав. Лукашэвіч. — Наша арганізацыя гаспадарчаразліковая. Мы маем планы і павінны іх выконваць. — Памаўчаўшы крыху, ён працягвае: — Дык вось, мінулы год мы завяршылі не так ужо і дрэнна. Гадавы план выканан датэрмінова — да 20 снежня. У гонар XXII з'езда партыі сувязісты абавязаліся дадатковa прадаць розных перыядычных выданняў, а таксама кніг і брашур на 72 тысячы рублёў. Сваё слова мы стрымалі. Дык у чым жа вы хочаце нас абвінаваціць?—ужо нездаволена пытае ён у мяне.

Давялося сказаць тав. Лукашэвічу, што абвінавачванне — справа пракурора, мая ж задача — высветліць, чаму ў многія раёны і гарады Беларусі для рознічнага продажу не паступаюць рэспубліканскія часопісы і газеты. Расказваю яму пра пісьмы, якія атрымала рэдакцыя, чытаю іх.

Маўчым. Я чакаю, што скажа Іван Антонавіч, а ён, відаць, абдумвае свае адказы. І раптам па яго твары зноў прабегла вясёлая ўсмешка і ў голасе я адчула ўпэўненасць:

— Я на вашым месцы не прымаў бы ўсур'ёз гэтыя пісьмы, — раіць ён. — Ведаеце, хто больш за ўсё дасылае падобныя скаргі? Той, хто надрукаваў у газеце ці часопісе свой допіс і хоча пасля мець аўтарскі экземпляр. Паверце майму вопыту. Вы думаеце, што гэтыя аўтары сур'ёзна цікавяцца чым-небудзь і ім патрэбен часопіс для работы? Не, ім абы напісаць. А раптам усё ж надрукуюць?..

Прызнаюся, я не чакала, што пачую такое тлумачэнне ад таварыша, які адказвае за рознічны гандаль перыядычнымі выданнямі ў рэспубліцы. Трымаючыся логікі Івана Антонавіча, усё было б добра, каб не гэтыя людзі, якім спакойна не сядзіцца ў сваіх раёнах, дык яны пішуць... І чаго толькі хочуць? Падавай ім «Полымя», «Маладосць», «Неман», «Сельскую гаспадарку Беларусі», «Бярозку», рэспубліканскую літаратурную газету. Ну, добра, закажа кіяскёр усе гэтыя часопісы, а яны, гэтыя «пісакі», купяць адзін-два экземпляры, і шукай пасля ветру ў полі. Не ідуць больш у кіёск. Што тады загадаеце рабіць кіяскёру? Заказаў — значыць прадай. Не прадасі — будуць у цябе вялікія таварныя лішкі, а за гэта па галоўцы не пагладзяць.

Пра ўсё гэта тав. Лукашэвіч расказвае з яўным задавальненнем. І вывад напрошваецца сам: нічога, маўляў, зрабіць нельга.

Знаёмлюся з заяўкамі, якія прысылаюць абласныя аддзелы «Саюздруку» ў Мінск. Усё той жа сумны малюнак. Вось Брэсцкая вобласць. На снежань 1961 года было заказана (заўважым: на ўсю вобласць!) 3 экземпляры часопіса «Маладосць», 8 — «Неман», 3 — «Літаратуры і мастацтва», 42 — «Беларусі» і ніводнага экземпляра «Полымя». Прычым, усе гэтыя выданні ў большасці сваёй застаюцца ў самім Брэсце. Можа, становішча выправілася ў студзені 1962 г.? На жаль, не. З невялікімі адхіленнямі падобныя «заказы» паступалі да тав. Лукашэвіча з Брэста на працягу ўсяго мінулага года.

Як жа мірыцца з падобным становішчам начальнік Брэсцкага абласнога аддзела «Саюздруку» тав. Чарнушэвіч? На ўсю вобласць у продажы ў розніцы няма ніводнага экземпляра старэйшага ў рэспубліцы літаратурна-мастацкага часопіса «Полымя», ёсць мізэрная колькасць іншых літаратурна-мастацкіх выданняў. Дык што ж гэта за работа такая? І хіба можна за агульнымі лічбамі выканання плана не бачыць такіх абуральных фактаў? Нават у гарадах Баранавічы, Пінск, Брэст, дзе знаходзяцца вялікія чыгуначныя станцыі, і там у кіёсках «Саюздруку» не знойдзеш рэспубліканскіх літаратурна-мастацкіх часопісаў.

Можа, лепш наладжаны продаж рэспубліканскіх перыядычных выданняў у розніцу ў Гомельскай вобласці? На вялікі жаль, і там амаль тое ж самае. Не купіш газету «Літаратура і мастацтва» ў Рэчыцы, Мазыры, Рагачове, Жлобіне, а ў Гомель яе ідзе толькі тры экземпляры. Гомельскія кіяскёры заказалі на снежань 5 экземпляраў «Полымя». Усе іншыя раёны і гарады гэтага часопіса не атрымліваюць.

У Мінскай вобласці 25 раёнаў. Працуе звыш 60 кіёскаў. І вось як афармлен заказ на студзень 1962 года: 15 экземпляраў «Маладосці», 7 — «Немана», 13 — газеты «Літаратура і мастацтва» і ніводнага экземпляра часопіса «Полымя».

У Магілёўскую вобласць у снежні 1961 года паступіла толькі 6 экземпляраў «Полымя», 2 экземпляры «ЛіМ'а», 7 экземпляраў «Немана», 11 — «Маладосці». Істотна не змяніліся заказы на студзень па Магілёўскай і Гродзенскай абласцях.

Асобна варта спыніцца на горадзе Мінску. Як станоўчае, неабходна адзначыць, што за мінулы год у сталіцы значна павялічылася колькасць кіёскаў «Саюздруку». Цяпер іх у Мінску больш за 100. Многія з іх па-сапраўднаму прыгожыя, у іх многа святла і прастору. На Ленінскім праспекце некаторыя кіёскі працуюць у дзве змены. Гэта зручна, можна набыць газету, часопіс і раніцай, і вечарам.

Самы шматлікі атрад распаўсюджвальнікаў перыядычных выданняў — сталічныя кіяскёры — не вельмі ўважліва паставіўся да афармлення сваіх заказаў. У снежні заказана ў Мінску 66 экземпляраў «Полымя», «Маладосці»—112, «Немана» — 109, «ЛіМ'а» — 110 і «Беларусі» — 300 экземпляраў. Ды гэта ж кропля ў моры! І яшчэ адна характэрная дэталь. Палавіна мінскіх кіёскаў зусім не заказвае літаратурна-мастацкія выданні і ўсё па адной і той жа прычыне: «не ідуць, не пытаюць».

Цяпер падсумуем: у снежні на ўсю рэспубліку (гэта значыць, на 136 раёнаў) у рознічны продаж ішло: 100 экземпляраў «Полымя», 190—«Маладосці», 138—«ЛіМ'а», 441 — «Немана» (з іх каля 300 пасылаецца за межы рэспублікі) і 840 экземпляраў «Беларусі». Мала чым адрозніваюцца заказы, якія паступілі на студзень 1962 года.

Такім чынам, большая палавіна гэтых заказаў належыць Мінску, астатняя частка ідзе галоўным чынам у абласныя цэнтры. Што ж, цяпер сапраўды паспачуваеш усім тым таварышам, якія пішуць у рэдакцыі і патрабуюць, каб у кіёсках гарадоў і раённых цэнтраў можна было набыць любы рэспубліканскі часопіс і газету.

Абуральна, што Беларуская рознічная кантора «Саюздруку» фактычна ператварылася ў рэгістратара. Яе работнікі не праявілі не толькі ініцыятывы, а нават простай службовай зацікаўленасці, як нам здаецца, у галоўным: як кіяскёры афармляюць заказы, які яны маюць актыў з ліку пакупнікоў і што робяць, каб яго пашырыць.

— Бачыце, — тлумачыць тав. Ігнатовіч, — мы звязаны па руках і нагах. Ёсць загад міністра сувязі СССР за нумарам 672 ад 22 кастрычніка 1959 года, які катэгарычна забараняе ўносіць якія б там ні было змены ў заяўкі, што прысылаюць кіяскёры. Калі мы вышлем ім звыш таго, што яны заказалі, дык кіяскёр мае права вярнуць нам прысланыя газеты і часопісы.

— А ці не здаецца вам, што за гэтым загадам вельмі ўжо лёгка хавацца перастрахоўшчыку? —пытаюся я. — Ну вось, уявіце сабе кіяскёра, які заказаў 20 экземпляраў часопіса «Полымя» і не прадаў іх. Вы адразу прымеце належныя меры. Дык навошта яму ўсе гэтыя клопаты, калі значна спакайней заказаць нейкі мінімум, а яшчэ лепш нічога не заказваць. Так жа робяць у Брэсцкай і іншых абласцях.

— Бачыце, — гаворыць тав. Ігнатовіч. — Мы павінны пільна сачыць за тым, каб не асядалі на нашых складах часопісы, газеты. За 1960 год было спісана розных брашур, кніг, газет і часопісаў больш як на 250 тысяч рублёў. Значыць, каб не было залежаў, нам трэба строга кіравацца гэтым загадам.

Вядома, нельга загружаць гандлёвую сетку «Саюздруку» нікому непатрэбнымі перыядычнымі выданнямі. Таму неабходна ўважліва вывучаць заяўкі пакупнікоў. Ёсць у кіяскёраў спецыяльныя сшыткі, у якія яны абавязаны запісваць усе заяўкі пакупніка. Фармальна ў гэтых сшытках ёсць сякія-такія запісы. Але, як правіла, яны не адлюстроўваюць сапраўдных патрэб савецкага чалавека. Бо калі б гэта было так, абавязкова знайшліся б пакупнікі і ў Полацку, і ў Брэсце, і ў Жлобіне, і ў Баранавічах.

Абласныя аддзелы і райарганізатары «Саюздруку» вельмі слаба кантралююць работу кіяскёраў, не цікавяцца тым, што яны прапануюць пакупніку, як вывучаюць яго запатрабаванні. Здавалася б, гэтай справай павінен быў сістэматычна займацца і аддзел арганізацыі распаўсюджвання друку ў розніцу, якім загадвае тав. Самадураў. На вялікі жаль, яго арганізуючай ролі да гэтага часу не адчувалася. Бо што ж гэта за арганізацыя, калі цэлыя вобласці, ужо не гаворачы пра гарады, раёны, не атрымліваюць «Полымя», «Літаратуры і мастацтва» і іншых выданняў. Ці ж можна мірыцца з гэтым, лічыць гэта нармальнай з'явай?

Мы многа гаворым пра тое, што трэба зрабіць, каб усё ж рэспубліканскія перыядычныя выданні своечасова даходзілі да чытача. Выказваюцца слушныя пажаданні — палепшыць рэкламу. Гэта сапраўды самы занядбаны ў нас участак работы. Нашы выдавецтвы і рэдакцыі газет і часопісаў гэтай справай як след не займаюцца. Для прапаганды выданняў шырэй трэба выкарыстоўваць радыё і тэлебачанне, часцей трэба наладжваць сустрэчы работнікаў рэдакцый з чытачамі. Магчыма варта практыкаваць продаж літаратурна-мастацкіх выданняў на камісійных умовах. Для вопыту можна ўзяць хоць бы адну вобласць і паглядзець, якія гэта дасць вынікі.

Мы патрабуем ад кніжных магазінаў шырокай арганізатарскай работы сярод пакупнікоў. Работнікі прылаўка, кніганошы ідуць на прадпрыемствы, у калгасы, саўгасы і знаходзяць там пакупнікоў, а кіяскёры «Саюздруку» гэты рубеж яшчэ і не спрабавалі браць. За ім жа тоўпіцца невычэрпная магчымасці.

Я. ДАНСКАЯ.

«НЕМАН»

Студзень—люты

Першы нумар часопіса адкрываецца публіцыстычным артыкулам Г. Будая «У вялікім паходзе».

Пад рубрыкай «Неман» на цаліне» змешчаны вершы В. Тараса, Ул. Варно, І. Шклярэўскага, Н. Кісліка і нататкі Г. Папова «Зямля раздольная».

Проза прадстаўлена раманам С. Прошына «Я забыўся на цішыню», аповесцю Э. Карпачова «Сцюдзёныя хвалі» і апавяданнем А. Браілоўскага «Люся, Віцька і прас».

Друкуецца новы верш Б. Спрынчана.

У раздзеле «Навука і жыццё» змешчаны артыкул Б. Розена «Палімеры служаць народу».

Літаратурная крытыка і бібліяграфія прадстаўлена артыкуламі Т. Хадкевіча «Гады і праца» (да 50-годдзя Ул. Карпава), А. Саннікава «Час дзеяння—нашы дні» і рэцэнзіямі на кнігі «Вершы і паэмы» М. Чарота, «Беларуская байка» Я. Казекі, зборнік успамінаў аб абароне Брэсцкай крэпасці «Гераічная абарона».

У радзеле «Адгалоскі мінулага» — артыкул С. Місско «Скамарохі на Беларусі».

Апавяданне І. Аношкіна «Памылка» і байка М. Стручына «Каза і свіння» складаюць раздзел «Сатыра і гумар».

Чалавек бачыў Леніна. Бачыў і слухаў.

Як многа значыць гэта для дзяцей, што носяць чырвоны гальштук і называюць сябе «ўнукамі Ільіча»!

Піянеры 6 «А» класа 22 сярэдняй школы горада Магілёва сабраліся вакол старога камуніста, пенсіянера Васіля Антонавіча Вераб'ёва і слухаюць яго з бліскучымі, усхваляванымі вачыма.

Фота Ч. Мезіна (БЕЛТА).

Выйшлі з друку

У Дзяржаўным выдавецтве БССР выйшлі з друку і паступілі ў продаж наступныя кнігі мастацкай, дзіцячай і музычнай літаратуры.

Анталогія беларускай паэзіі ў трох тамах. Том 1. Прадмова К. Крапівы і В. Барысенкі. Укладальнікі тома С. Александровіч, Ю. Пшыркоў. Рэдактар Пятрусь Броўка. Мастак Г. Клікушын. Тыраж 4 тыс. экз., стар 636. Цана 1 руб. 11 кап.

Анталогія беларускай паэзіі ў трох тамах. Том 2. Укладальнікі тома Р. Бярозкін, М. Лужанін. Рэдактар Максім Танк. Мастак Г. Клікушын. Тыраж 4 тыс. экз., стар. 728. Цана 1 руб. 22 кап.

Сяргей Грахоўскі. Сёння і заўтра. Вершы. Для сярэдняга ўзросту. Малюнкі Л. Асецкага. Тыраж 7.350 экз., стар 48. Цана 7 кап.

А. Платнер. Вясёлая іголка. Вершы для сярэдняга ўзросту. Аўтарызаваны пераклад з яўрэйскай мовы. Мастак І. Іскрынская. Тыраж 6.950 экз., стар. 48. Цана 11 кап.

Багдан Чалы. Прадаўцы заморскіх сувеніраў. Пераклад з украінскай мовы А. Вялюгіна. Для малодшага ўзросту. Малюнкі Е. Лось і Г. Якубені. Тыраж 16 тыс. экз., стар. 16. Цана 7 кап.

Гары Блум. Трансвальскі эпізод. Раман. Пераклад з англійскай мовы В. Няхай і А. Пракоф'евай пад рэдакцыяй Я. Семяжона. Пасляслоўе Язэпа Семяжона. Мастак І. Капелян. Тыраж 3.700 экз., стар. 336. Цана 98 кап.

Ю. Семяняка. Песні. На словы А. Бачылы, Н. Глейзарава, М. Брауна, А. Кронгауза, А. Лазнявога, А. Русака, М. Шушкевіча і Л. Яўменава. Тыраж 1.550 экз., стар. 36. Цана 31 кап.

Н. Коньшын. Рэчыцкая лірычная. Для жаночага хору з баянам. Словы П. Вішняка. Мастак А. Сапетка. Тыраж 5.400 экз., стар. 6. Цана 3 кап.

І. Кузняцоў. Да яснае мэты. Для хору з ф-на. Словы Ул. Дубоўкі. Мастак А. Сапетка. Тыраж 4.300 экз., стар. 4. Цана 2 кап.

Р. Пукст. Не стрымаць, не спыніць. Для хору з ф-на. Словы Я. Журбы. Мастак А. Сапетка. Тыраж 4.100 экз., стар. 4. Цана 2 кап.

Сярод кніг

ПРА НЕЗАБЫЎНАЕ

Калі для Радзімы наступае часіна грозных выпрабаванняў, калі ёй пагражае небяспека, — сапраўдныя сыны і дочкі яе ўзнімаюцца на абарону. Яны, бясстрашныя, нязломныя, праз пакуты, кроў і смерць ідуць да перамогі. Менавіта такімі людзьмі і былі ў час Вялікай Айчыннай вайны падпольшчыкі Мінска, пра якіх адзін з іх, Уладзімір Казачонак, расказвае ў кнізе «Калі Радзіма ў небяспецы».

Асобныя звесткі аб мінскім падполлі, успаміны яго ўдзельнікаў пачалі з'яўляцца ў газетах і часопісах адразу ж пасля вайны. Але яны не давалі яскравага ўяўлення пра размах, пра гераіку барацьбы мінскіх патрыётаў у цэлым. Летась былі апублікаваны матэрыялы, падрыхтаваныя Інстытутам гісторыі партыі пры ЦК КПБ і Інстытутам гісторыі АН БССР, у якіх найбольш акрэслена пададзена гісторыя ўзнікнення і дзейнасці партыйнага і камсамольскага падполля Мінска. Іх дапаўняюць напісаныя ў апошні час памянёная вышэй кніжка і нарыс І. Новікава «Руіны страляюць ва ўпор».

«Запіскі» Ул. Казачонка каштоўныя перш за ўсё тым, што іх аўтар — непасрэдны сведка і ўдзельнік падзей, пра якія расказвае. Героі кнігі — людзі, з якімі яму даводзілася сустракацца, гутарыць, рабіць агульную справу.

Арганізаваная, знітаваная і мужная, армія мінскіх падпольшчыкаў наносіла ворагу ўдар за ўдарам. Пад нагамі акупантаў гарэла зямля. Небяспечнымі для ворага сталі вуліцы і плошчы, скверы і паркі, прыціхлыя дамы і руіны.

Умовы, у якіх вялі барацьбу мінскія падпольшчыкі, былі надзвычай цяжкія. Вораг шалеў, рабіў усе захады, каб разграміць арганізацыю. Яму нярэдка ўдавалася натрапіць на след падпольшчыкаў, арыштоўваць, знішчаць іх. Але падполле жыло і змагалася. Зноў і зноў чуліся выбухі, зноў і зноў выходзілі лістоўкі, газеты — «Веснік Радзімы», «Звязда», несучы людзям, не менш страшнае для акупантаў, чым кулі і міны, праўдзівае, палымянае бальшавіцкае слова.

«Запіскі» яшчэ раз сведчаць, якая неймаверная вытрымка, якая сіла волі ўласцівыя савецкаму чалавеку. Старыя і малыя, мужчыны і жанчыны, камуністы, камсамольцы і беспартыйныя, самыя звычайныя, непрыкметныя да вайны людзі па закліку сэрцаў і сумлення рабілі, здавалася б, немагчымае. Не парабольшваючы, на канкрэтных прыкладах аўтар расказвае, як паводзілі сябе падпольшчыкі на допытах, перад кулямётамі і вісельнямі. Вось, напрыклад, што пісаў перад смерцю скатаваны, знявечаны падпольшчык Іван Харытонавіч Казлоў: «Сапраўдны патрыёт той, хто смела глядзіць у вочы смерці. Не трэба слёз. Не трэба сумаваць. Наша кроў не праль ецца дарэмна... Жыць, жыць! Вось як хочацца! Ды не хавацца за спіну таварышаў, а са зброяй у руках у штодзённай барацьбе з ненавіснымі шакаламі — вось уся прыгажосць, уся мэта жыцця. Жыць для Радзімы, для савецкага свабадалюбівага народа, змагацца за гонар і свабоду яго — у гэтым уся прыгажосць жыцця, гэта ў дадзены момант ідэал жыцця».

З найбольшай цікавасцю чытаецца трэці раздзел кнігі, асабліва яго заключныя старонкі. Тут расказана, як падпольшчыкі і партызаны адпраўлялі на той свет фашысцкіх памагатых — беларускіх нацыяналістаў Акінчыца, Казлоўскага, Іваноўскага, як доўга «палявалі» яны на галоўнага ката беларускага народа гаўляйтэра Кубэ.

Расказваючы пра мінскае падполле на працягу ўсяго перыяду яго дзейнасці (чэрвень 1941—ліпень 1944 года), аўтар падае багаты фактычны матэрыял, называе дзесяткі і дзесяткі прозвішчаў добра вядомых яму людзей, характарызуе іх, прыводзіць немалаважныя падрабязнасці, якія маглі захавацца толькі ў памяці неспарэднага сведкі і ўдзельніка падзей. Тым не менш хацелася б, каб кніжка пра мінскае падполле — гэты важны эпізод у гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — была напісана крыху інакш.

Чытаючы кнігу, адчуваеш, што пісалася яна паспешліва. Гэтым, у пэўнай меры, тлумачыцца яе сухасць, яе газетны, нейкі афіцыйны стыль. Старонкі, дзе гаворыцца аб узнікненні падпольных ячэек, надта ж аднатыпныя: прозвішчы, даты. З другога боку, аўтар мнагаслоўны там, дзе гэта не патрэбна. Так, доўга і нудна расказвае ён аб пераходзе лініі фронту ў пачатку вайны: як сустрэў пастуха, пра што гаварыў з ім, як заходзіў у хаты да калгасніц, якая вялася там размова, чым частавалі. Такая ж шматслоўнасць, расцягнутасць прыкметна і ў канцы другой часткі, дзе аўтар гаворыць пра тое, як ён прабіраўся на Вялікую зямлю.

Заўважаюцца разыходжанні паміж фактамі ў кнізе і іншых крыніцах. Так, падпольны гарком, па кнізе, створаны ў самым пачатку лістапада сорак першага года; у матэрыялах жа, апублікаваных Інстытутам гісторыі партыі пры ЦК КПБ і Інстытутам гісторыі АН БССР, гэтая падзея аднесена да канца месяца. У кніжцы або зусім не названы, або памянёны мімаходзь прозвішчы некаторых падпольшчыкаў, якім у матэрыялах Інстытутаў адведзена першараднае месца (Балашоў, Паўлечка).

Кніжка намного выйграла б, калі б аўтар не быў паспешлівым не толькі пры апісанні падзей, але і пры паказе, пры раскрыцці вобразаў людзей. Аб няўлоўным, легендарным мінскім падпольшчыку «Жане» (Івану Кабушкіну) расказана недаравальна мала. Між тым, гэты бясстрашны, вынаходлівы чалавек, які ўзначальваў пры гаркоме аддзел па барацьбе са шпікамі, правакатарамі і здраднікамі, быў вельмі прыкметнай фігурай у мінскім падполлі. У гэтым пераконваешся, калі чытаеш нарыс І. Новікава «Руіны страляюць ва ўпор». І справа тут не ў мастацкім домысле, а ў тым, што аўтар кнігі не «пакапаўся» як след у архівах, прайшоў міма цікавых дакументаў, чамусьці не выкарыстаў іх (пісьмо Кабушкіна цесцю, запіскі Сапуна і інш.).

Героіка мінскага падполля чакае новых праўдзівых гісторыкаў, удумлівых і здольных мастакоў слова. Кніжка Уладзіміра Казачонка «Калі Радзіма ў небяспецы» — адна з першых спроб адлюстравання барацьбы савецкіх людзей у тыя незабыўныя, грозныя дні.

М. САЎЧУК.

Уладзімір Казачонак. «Калі Радзіма ў небяспецы». Запіскі аб мінскім падполлі. На рускай мове. Мінск, 1961.

І ПУБЛІЦЫСТ—МАСТАК

ПА СТАРОНКАХ ЧАСОПІСА «МАЛАДОСЦЬ»

Публіцыстыка гэта жанр, які, паводле заўвагі В. Бялінскага, вызначае душу часопіса, у той час, як проза мастацкая, белетрыстыка — толькі яго твар. Праўда, тут дарэчы заўважыць, што кажучы так пра публіцыстыку, В. Бялінскі меў на ўвазе публіцыстыку мастацкую, прасякнутую дыханнем сучаснасці і сагрэтую майстэрствам, талентам пісьменніка, напоўненую глыбокім чалавечым роздумам і заклапочанасцю публіцыста-грамадзяніна.

Першарговая задача нашай публіцыстыкі—паказаць усенародную барацьбу савецкага народа за ажыццяўленне грандыёзных планаў камуністычнага будаўніцтва, намечаных XXII з'ездам Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, паказаць духоўную веліч чалавека будучыні, светлы ўзлёт думкі савецкіх людзей, што заваёўваюць космас, багацце і прыгажосць душы нашага сучасніка і агіднае нутро бюракрата, кар'ерыста і дармаеда, светлыя мары людзей аб міры і шчасці і злосныя падкопы новаяўленых прэтэндэнтаў на сусветнае панаванне. Усё гэта павінна быць у полі зроку публіцыста, усё даступна яго пафасу, іроніі, абурэнню.

Мінулы год быў для нашага народа годам найвялікшых здзяйсненняў. Бяспрыкладныя палёты ў космас герояў-касманаўтаў Юрыя Гагарына і Германа Цітова, напружаная праца савецкіх людзей па выкананню велічных планаў і іх перамогі на ўсіх участках прамысловага, сельскагаспадарчага і культурнага будаўніцтва, усенароднае абмеркаванне і прыняцце XXII з'ездам партыі новай Праграмы КПСС—праграмы пабудовы камуністычнага грамадства, —такім быў мінулы год. У якой ступені знайшлі адлюстраванне гэтыя падзеі ў публіцыстыцы часопіса?

Багатае і змястоўнае жыццё нашага народа было ў цэнтры ўвагі «Маладосці». З нумара ў нумар пад рубрыкамі «Дарогамі сямігодкі» і «Гары, камсамольскі аганёк», часопіс друкаваў матэрыялы аб уздыме прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, аб працоўных поспехах нашай рабочай і калгаснай моладзі, аб слаўных справах яе маладых рук, светлых імкненнях і прыгожых марах, матэрыялы аб развіцці беларускай літаратуры, назукі, мастацтва, кіно. Тэматыка публіцыстычных выступленняў часопіса была шырокай і цікавай.

У мінулым годзе ён расказаў чытачам пра будні маладзёжнай жывёлагадоўчай фермы калгаса імя Леніна Слаўгарадскага раёна і салігорскіх шахцёраў, змясціў інтэрв'ю старшыні Савета народнай гаспадаркі рэспублікі А. Тарасава і рэпартаж з Гродзенскага медыцынскага інстытута, замалёўку пра грамадскае канструктарскае бюро трактарнага завода і нарыс пра заатэхніка калгаса «17 верасня» Столінскага раёна Марыю Мішкавец, у кожным нумары з'яўляліся нататкі па пытаннях навукі, культуры і мастацтва.

Малады чытач, безумоўна, запомніў запіскі сталявара Мінскага трактарнага завода А. Азарава «Людзі, якія вараць сталь» (№ 8). Гэта шчыры, усхваляваны расказ чалавека пра сваіх сяброў, пра тых, хто поплеч ідзе ў працы і ў жыцці. Аўтар запісак не шукаў нейкіх асаблівых слоў, іх падказала яму сэрца. І няхай гэта толькі фрагментарныя запіскі, паасобныя сцэнкі з жыцця вялікага калектыву,—мы бачым у кожнай з іх чалавека, чалавека жывога, з яго хваляваннямі, радасцямі, няўдачамі, заклапочанага агульнанароднай справай.

Не застанецца па-за ўвагай чытача і нарыс І. Ласкова «Такія ў нас сэрцы...»—пра студэнтаў хімічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна (№ 4). Хутчэй, гэта нават і не нарыс, а кароткія запіскі аўтара пра сваіх сяброў-хімікаў. Матэрыял захапляе шчырасцю і цеплынёй. Гэта не толькі расказ пра сяброў, але і роздум над тым, што хвалюе нашу студэнцкую моладзь. Аўтар з усім запалам маладосці абураецца настроямі абыякавасці, раўнадушша, «эстэцтвуючага» нігілізму, якія, на жаль, бытуюць сярод некаторай часткі студэнцтва. І робіць гэта аўтар па-мастацку: «Гэта людзі, як кажуць, без колеру, смаку і паху. Нібы дысталяваная вада... Да іх вельмі прыстала мянушка —«пасівісты». Аўтар здолеў заўважыць і другое: з кожным днём усё менш і менш «пасівістаў» сярод студэнцтва. «Неўзабаве настане дзень, калі апошні пасівіст перавернецца ў сваім ложку, пратрэ вочы, паглядзіць на вірлівае жыццё і скажа: «Колькі радасці я праспаў!» І пойдзе працаваць, закасаўшы рукавы».

Усхваляванасць расказа, непакой аўтара міжвольна перадаюцца чытачу, прымушаюць яго думаць, разважаць, па-іншаму зірнуць не толькі на сваіх таварышаў, але і на самога сябе.

Усхваляванасцю і роздумам над фактамі жыцця вылучаюцца нарыс М. Гроднева «Дачка брыгады» (№ 7), артыкул М. Цімошака «Чым вымяраецца жыццё» (№ 1), рэпартаж А. Сінілава «Разведчыкі крочаць» (№ 6) і іншыя публіцыстычныя выступленні часопіса. Добрае ўражанне пакідае нарыс Б. Стральцова «Суседзі» — аб дружбе хлебаробаў украінскага калгаса «Праўда» і беларускага калгаса імя Уладзіміра Ільіча (№ 5). Расказвае аўтар вобразна, часам са светлым, дасціпным гумарам.

Да здабытку часопіса можна аднесці нарысы «Саша» М. Кірылава і «Адмаўленне ад крыжа» П. Місько (№ 8). Міхаіл Кірылаў, завуч Кобрынскай сярэдняй школы, узнімае надзённае пытанне выхавання маладога пакалення, а П. Місько расказвае пра атэіста-прапагандыста, настаўніка Крамяніцкай школы Зельвенскага раёна Уладзіміра Лаўрукевіча. Абодва нарысы вылучаюцца вобразамі людзей, пачуццём заклапочанасці аўтараў тым, пра што пішуць. Адчуваецца, што ўсё гэта вынашана ў сэрцы, многа разоў перадумана, узважана, хоць, праўда, некаторыя мясціны і гучаць крыху прамалінейна.

На жаль, далёка не пра ўсе публіцыстычныя выступленні «Маладосці» можна сказаць добрае слова.

У пачатку — некалькі фраз, затым — біяграфічная даведка пра героя нарыса ці рэпартажу, потым зноў халодныя агульныя словы, накшталт «спачатку было цяжка», падмацаваныя лічбамі і фактамі, і, урэшце, пафаснае закругленне. Вось прыблізная схема многіх матэрыялаў пра нашых харошых, слаўных людзей.

Жыве ў калгасе «17 верасня» Столінскага раёна цудоўная маладая дзяўчына, заатэхнік Маша Мішкавец. Не шукала яна лёгкага хлеба. Пасля заканчэння Пінскага тэхнікума паехала працаваць у калгас з адным жаданнем — працаваць як мага лепш на карысць любімай радзімы. Праца для яе—крыніца радасці і шчасця.

Вось бы і напісаць пра Машу гэтак жа светла і шчыра, як і само яе жыццё. Аднак Г. Мазанік не знайшоў для свайго нарыса (№ 3) прачулых слоў. Ён піша штампаванай і збітай мовай: «Але неўзабаве ў кароўніках і свінарніках заўважыліся перамены: праходы пачысцелі і сцены засвяціліся белізной. Паявіўся распарадак дня, і даяркі пачалі выходзіць на работу мінута ў мінуту...»

Каб стварыць жывы і паўнакроўны вобраз чалавека, аўтар павінен усёй душой адчуць, спазнаць, урэшце—палюбіць свайго героя. І калі гэтага пачуцця, свайго ўласнага роздуму над лёсам, характарам і справамі героя няма, а цеплыня і шчырасць твора штучныя, падагрэтыя ўмоўным пафасам, то расказ пра чалавека падмяняецца напластаваннем спецыяльных тэрмінаў і багатай лічбавай характарыстыкай. І, як вынік усяго, паўстаюць не жывыя людзі, а схемы.

[Заканчэнне на 4-й стар.]

РАБОТЫ БЕЛАРУСКІХ ВУЧОНЫХ

Выдавецтва Акадэміі навук БССР рыхтуе да выдання разнастайную грамадска-палітычную і сацыяльна-эканамічную літаратуру, кнігі па літаратуразнаўству, мовазнаўству і мастацтвазнаўству, матэматыцы і фізіцы, біялогіі і тэхніцы.

Будуць выдадзены калектыўныя творы Інстытута філасофіі «За перамогу камуністычнай працы», «Ад сацыялізма да камунізма».

У бліжэйшы час выйдуць з друку IV, V, VI тамы Збору твораў Янкі Купалы, работы В. Барысенкі «Я. Колас. Жыццё і творчасць», В. Івашына «Ля вытокаў сацыялістычнага рэалізму». Да 80-годдзя народных паэтаў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа рыхтуюцца зборнікі «Народны паэт БССР», «Жыццё для народа». Першы зборнік складаецца з шасці раздзелаў. Сюды ўключаны матэрыялы, якія друкуюцца ўпершыню. У другі зборнік увайшлі артыкулы і ўспаміны аб Я. Коласу.

Інстытут мовазнаўства выдасць калектыўныя творы «Нарысы па беларускай дыялекталогіі», «Нарматыўная граматыка беларускай літаратурнай мовы», т. 1 (марфалогія). Інстытут мастацтвазнаўства—«Беларускае мастацтва», вып. III, «Беларускія прыказкі і прымаўкі» Ф. Янкоўскага, «Янка Купала і беларускі тэатр» А. Есакова, «Беларускае кіно» А. Красінскага, В. Смаля, Г. Тарасевіча, «Беларускі савецкі тэматычны жывапіс» П. Масленікава і інш.

Іван ШАМЯКІН

УРЫВАК З КІНААПОВЕСЦІ

НЕ ТОЙ ГОНАР

У кожнага пісьменніка ёсць свая ўлюбёная тэма. У мяне — сучаснае калгаснае сяло. Больш канкрэтна — тыя змены, часам непрыкметныя, якія адбываюцца зараз у быце, культуры, узаемаадносінах людзей. Усё новае перамагае ў выніку барацьбы са старым, адсталым, аджываючым. Барацьба гэтая набывае самыя разнастайныя формы, часам даволі вострыя, часам камічна-смешныя.

Старшыня калгаса — нядрэнны гаспадар, але з поглядамі, якія склаліся ў пэўны перыяд. Ён перакананы, што адзін усё можа і ўсё робіць, а таму яму і ўсё дазволена. Не, ён не злоўжывае ўладай. Знешне дзейнічае па закону. Але як?

Скончыўшы універсітэт, прыязджае на працу ў родную вёску яго дачка (не без дапамогі бацькі). Дзяўчына пакахала свайго былога аднакласніка, які цяпер працуе... шафёрам — возіць старшыню калгаса. Маці ў роспачы: іх адзіная дачка, скончыўшы універсітэт, хоча выйсці замуж за шафёра? Жах!

«Ну, сёння шафёр, а заўтра — дзяржаўны дзеяч», — адказвае разважлівы і па-свойму разумны бацька і вылучае будучага зяця на пасаду старшыні сельсавета. Але ў хлопца зусім іншыя прынцыпы, іншыя погляды на жыццё, на працу, на адносіны людзей. Яго самастойнасць закранае гонар «усемагутнага гаспадара». Нарастае канфлікт.

Такая аснова сюжэта кінааповесці «Не той гонар», якую я нядаўна здаў кінастудыі «Беларусьфільм».

Хацінка, ля якой некалі спыняўся Наготка. Хлопцы, вучні старэйшых класаў і студэнты, што на канікулах, вясёлыя, бадзёрыя, завіхаюцца вакол з піламі, сякерамі, рыдлёўкамі. Адны скобляць жэрдкі, другія—закапваюць новыя шулы. Наготка на самаробным верстаку працуе фуганкам. Платон Назаравіч са шкларэзам у руках прымярае шыбу. Дзед, той сівы стогадовы дзед, што драмаў некалі на прызбе, гаспадар хаты, тупае каля нечаканых гасцей разгублены, нават спалоханы. Яму цяжка зразумець усё адразу.

— Шыночкі, плаціць няма чым,—шамкае дзед.

Хлопцы рагочуць. Дзед смяецца таксама і махае на іх рукой. Звяртаецца да старога настаўніка:

— Нажаравіч, а плаціць чым?

— Добрым «дзякуй».

— Што?

Дзед прыстаўляе далонь да вуха. Ён не чуе. Але ён ведае адно: калі з маладымі іх стары настаўнік, які нават яго, старога, некалі пасля рэвалюцыі вучыў чытаць і якога ўсе тут паважаюць,—значыць, робіцца нешта вельмі добрае. І дзед нават спрабуе памагчы маладым.

З хаты праз адчыненае акно даносіцца дзявочы смех. Выглядае запырсканы крэйдай смешны і мілы тварык у чырвонай касынцы. Дзяўчаты пачынаюць спяваць. Іх падтрымліваюць хлопцы. І дзед, увесь белы, як прывід, застывае, прыслухоўваецца і раптам... надзвычай хораша ўсміхаецца—зусім неяк па-дзіцячы...

А ў гэты момант другі чалавек усё больш і больш пахмурнее. Гэта Адам Лаўрэнавіч Пылец. Ён стаіць каля адчыненага акна і назірае за тым, што робіцца на другім баку вуліцы, амаль насупраць яго хаты, крыху наўскось.

Пылец, па ўсім відаць, толькі што ўвайшоў і, напэўна, з гарода, бо ўсё, што ўбачыў на вуліцы, для яго—нечаканасць.

Алена Іванаўна мые падлогу. Поўнай жанчыне цяжка нахіляцца, яна крэкча. Просіць мужа:

— Пачакай, Адамка. Зараз кончу.

— Што гэта такое?—пытае ён суровым голасам.

— Што? — палохаецца жонка і выпростваецца, падыходзіць да акна.

— Аа-а... Рамантуюць старому Халімону хату. Гэта Алесь!—паведамляе яна з гонарам.—Ірына кажа, што сельсавет вырашыў памагчы рамантаваць старым і ўдовам. Каб людзям добра было і каб сёлы папрыгажэлі.

— Ідыёт!—гнеўна цэдзіць праз зубы Пылец.

— Што ты, Адамка?.. здзіўляецца жонка.—Хіба гэта дрэнна—памагчы людзям?

— Як памагчы? Дура!—крычыць ён і вырывае з яе рук мокрую анучу.

Алена Іванаўна спалохана адступае. Але ён не замахваецца. Не. Ён сціскае анучу ў руцэ, і з яе цурчыць на чыстую падлогу брудная вада.

Ён пытае стрымана, амаль спакойна:

— Каб я цябе зараз пляснуў па мордзе гэтай анучай—прыемна табе было б?

— Што ты, Адамка?

— Вось гэтак пляснулі мне. Разумееш?

Не, яна не разумее. Не разумее, хоць трыццаць год пражыла разам з гэтым чалавекам.

У хату ўбягае Ірына, напяваючы вясёлую песеньку. І сама яна—як песня, уся свеціцца радасцю і весялосцю. У руках у яе невялічкае рэшата, поўнае буйнай спелай маліны.

— Добры дзень, тата. Я сёння яшчэ не бачыла цябе.

Яна ставіць маліну на стол, пачынае перабіраць, найбольш буйныя і прыгожыя ягады кідаючы ў рот. Вусны яе ў малінавым саку. Алена Іванаўна дамывае падлогу. Крэкча і ўздыхае.

Адам Лаўрэнавіч нейкі момант назірае за дачкой, потым кажа пахмура:

— Памажы маці падлогу мыць, ягада-маліна,— і са знявагай:—Чаму вас вучылі!

Ірына здзіўлена: даўно ўжо бацька так не гаварыў з ёй. Без слоў бярэ яна ў маці анучу, пачынае мыць.

Алена Іванаўна, уздыхаючы, выходзіць.

Пылец праходзіць па пакоі, відаць, знарок з чыстай палавіны на брудную і назад. Ірына моўчкі заціраё яго сляды.

— І скажы свайму дурню,—кажа ён ад акна,— каб такіх конікаў не выкідваў. Старшыня сельсавета! Сабраў хлапчукоў і рамантуе плот. Скажы, калі ласка, гераізм! Дэмагогія. Танны аўтарытэт.

Ірына разумее бацьку. Ірына добра разумее яго. Усміхаецца ў мокрую падлогу і... падлівае масла ў агонь:

— Ён яшчэ хоча прымусіць цябе знесці свінарнік.

Гэта—як гром на яго галаву. Ён на момант слупянее.

— Які свінарнік?

— Што ты пачаў будаваць у Барку.

— Прымусіць мяне.

— Ага.

Не, ён не зрываецца і тут. Смяецца так, быццам рве палатняную тканіну.

— Сіла—твой Алесь.

У словах гэтых—здзек і знявага да яе каханага, і гэта Ірыну не можа не закрануць, яна ж дачка свайго бацькі. Дзяўчына выпростваецца, тыльным бокам мокрай рукі адкідвае валасы.

— А праўда, тата... Самае прыгожае месца... Дзе гуляюць дзеці. Ходзяць закаханыя...

— Калі закаханыя не паядзяць сала, ім не ўздумаецца туды хадзіць.

Гэты грубаваты адказ крыху бянтэжыць Ірыну, і яна спрабуе перавесці размову на іншы план:

— Будуем камунізм, тата. Дык няўжо...

— Пакуль што будую яго я. А вы спажываеце плады працы іншых і думаеце, што камунізм—гэта, калі ў Барку на соснах вырастуць райскія яблыкі... А вы будзеце ляжаць пад гэтымі соснамі, разявіўшы раты...

Ірыне здаецца, што бацька бачыў, як яны ляжалі там з Алесем, і яна бянтэжыцца, нахіляецца, пачынае дамываць падлогу. Пылец адчувае сваю перамогу і зноў, цяпер ужо яўна знарок, ступае на лужыну брудной вады каля дзвярэй і ідзе па чыстым.

— Дык вось скажы свайму... старшыні... Я яго нарадзіў, я яго і...

Ірына ўздрыгвае, падымае галаву.

— Што?

— ....зноў пасаджу за руль. У лепшым выпадку.

Ёй ужо смешна з уласнага спалоху. Яна хавае ўсмешку і адказвае:

— Сам скажы. Вунь ён, цераз вуліцу.

— Не! Скажаш ты!—цвёрда і сурова загадвае Пылец.

Новыя вароты. Новая брамка. Новыя пафарбаваныя аканіцы. Усё гэта аздобіла старую хату, упісала яе ў ансамбль вуліцы, дзе большасць хат—новыя.

Заходзіць сонца.

Хлопцы падмятаюць стружкі, збіраюць інструмент. Самі з прыемнасцю аглядваюць сваю працу. Крыху збоку стаіць Ягор Саладуха з партфелем пад пахай, таксама любуецца на хату. Гаспадыня, старая жанчына, мітусіцца каля іх, не ведаючы, як аддзякаваць. Таямніча кажа:

— Хлопчыкі, хадземце, я вас хоць самагоначкай пачастую. Ёсць пляшачка яшчэ леташняй.

Ягор Саладуха нюхае ногаць вялікага пальца. Хлопцы смяюцца:

— Што ты, цётка Марфа. Старшыня сельсавета ў двары. Ён цябе ў турму ўпячэ за самагонку. Ведаеш, які ён!

— Алеська? Не ўпячэ. Я яму цётка. Хоць у трэцяй стрэчы, але цётка.

З брамкі выходзіць Алесь, апранаючы на ходу пінжак. Кажа:

— Увосень, цётка, абавязкова пасадзім дрэўцы. Усе пасадзяць, каб вуліца была—што сад.

— Добра, Алесь... Аляксандр Паўлавіч. Дзякую вам, даражэнькія.

Яна не адважваецца больш прапаноўваць пачастунак.

Хлопцы адыходзяць. Да жанчыны падыходзіць Ягор. Нюхае пазногаць.

— Дык паставіш чарку, кума?

— А табе завошта?—здзіўляецца старая.

— Я даў яму гэтую ідэю,—ківае ён на вароты.

Жанчына глядзіць на яго, нейкі момант раздумваючы.

— Ну, хадзем ужо... Выпі, і-дзе-я.

Жнівеньскі вечар. У сярэдзіне лета ніколі не бывае ў вёсцы гэтулькі святла, як цяпер. У кожным акне ярка гараць электралямпачкі без абажураў. Яшчэ не позна: рыкаюць каровы, рыпяць жураўлі, ляпаюць брамкі. Але ўжо збіраецца моладзь. Недзе чуваць гармонік. У другім баку спрабуюць свае галасы дзяўчаты—ці не ахрыплі за дзень?

Алесь і Ірына выходзяць з асветленай вуліцы ў поле.

Неба над імі зорнае-зорнае. Спачывае зямля, як маці пасля родаў. Цішыня. Спакой і ўраўнаважанасць адчуваюцца ў хадзе гэтых закаханых. Яны не лашчацца адно да аднаго, не абнімаюцца, не ціснуць рукі. Але ў той жа час адчуваецца, што ідуць блізкія людзі, якім усё ўжо ясна ў іх жыцці.

Пра што яны гавораць?

— Алесь, слаўны ты мой, не чапай ты яго. Узлуецца—нам жа горш будзе.

— Дык за што ён узлуецца?

— О, ты не ведаеш бацькі! Ён ужо крычаў, што ты пляснуў яму бруднай анучай.

— Далібог, не разумею... Чаму яму не падабаецца, каб сяло, калгас, дзе ён старшыня, папрыгажэлі?

— Ды не таму што не падабаецца. А гонар... Гонар яго. Ён трынаццаць год кіруе калгасам... А ты быццам вучыш яго... Выскокваеш наперад...

— Іра, нікуды я не выскокваю. Але я хачу не проста праседжваць месца, а зрабіць людзям карыснае нешта. Не могуць цяпер людзі жыць так, як жылі.

— Людзі не скардзяцца на жыццё... і на бацьку.

— Няўжо, калі ў хаце даволі сала—дык гэта вяршыня шчасця? Так думае твой бацька. Прабач, Іра, працаваў я з ім паўгода, прыглядаўся. І вось мой вывад: спыніўся Адам Пылец недзе на паўдарозе. Не ўбачыў, як за апошнія гады высока мы ўзляцелі. І можа добра, што я закрануў гэты яго гонар. Залішні ён у яго.

— Алесь, мілы. Цяжкае будзе наша з табой шчасце, калі вы пасварыцеся.

— Ды не буду я з ім сварыцца.

— Не чапай хоць гэты свінарнік. На ліха табе тая прыгажосць!

— Іра! Мне сорамна чуць ад цябе гэта. Не аднаму мне яна патрэбна. Але і табе. Тваім вучням, якіх ты будзеш выхоўваць. І я спадзяваўся, што ты паможаш мне.

— Ох, Алеська, не прыгодна я ў гераіні. Я хачу спакою і шчасця. З табой.

— Шчасце я табе абяцаю. А вось спакой...

— Мой мілы «маўчун»! Спакой арганізую я.

Яна абнімае яго. Ён кладзе ёй руку на талію. І так яны ідуць далей. Са змроку ўзнікае постаць. Чалавек мерае ўшыркі дарогу і сумна спявае зусім на іншы матыў:

— Пазарасталі сцежкі-дарожкі,
Дзе прахаджалі мілыя ножкі...

— Яўмен?—угледзеўшыся, здзіўляецца Алесь.

— А-а, сэрцаед! Гуляеш? — пагрозліва пытае п'яны.—Хацеў я даць табе па мордзе. Але не буду. Пагляджу і падумаю... Падумаю і пагляджу... А потым зноў падумаю...

Яўмен абмінае іх, ідзе далей.

— Пазарасталі мохам-травою,
Дзе мы гулялі, мілка, з табою...

— «Мілы, а не «мілка»!—гарэзліва крычыць услед яму Ірына. Ёй хочацца хоць якой-небудзь прыгоды.

— Пайшла к чорту!—адказвае з цемры Яўмен.

Ірына смяецца. Да Алеся:

— Як ён цябе назваў? Сэрцаед? Ох, памру... Чыё сэрца ты з'еў? Маё?

Вырысоўваюцца на фоне зорнага неба абрысы дрэў, нізкіх, з шырокімі кронамі. Сад. Гарыць у глыбіні агеньчык. Брэша сабака. Алесь ласкава свішча яму. Сабака радасна вішчыць, падбягае, кідаецца Алесю на грудзі. Ірына адхіляецца, каб не запэцкаў сукенку. Яны падыходзяць да агню. Полымя асвятляе саламяны будан, залатыя яблыкі на нізкіх галінах.

— Гуляеце?—пытае з будана старэчы рыплівы голас; сам вартаўнік не паказваецца, ён пазнае частых гасцей па кроках, па тым, як брэша сабака.—А я ўсё чакаю, калі вы паклічаце на вяселле.

Ірына смяецца.

— Паклічам, дзядзька Сцяпан.

Яны садзяцца на лавачку пры агні; па тварах іх бегаюць водбліскі полымя. Спачатку Алесь заклапочаны і задуменны, ён недзе яшчэ там—у той сур'ёзнай няскончанай размове. У Ірыны на твары—гарэзлівая весялосць. А потым яны як бы мяняюцца думкамі: на Ірынін твар кладуцца цені, моршчаць лоб, а Алесь увесь асвятляецца—не полымем, уласнай усмешкай. Ён горне дзяўчыну да сябе.

— А праўда—калі, Ірынка? У мяне і маці пытае.

— Што?—схамянулася яна.

— Наша вяселле калі?

— Калі? Першага верасня. Як толькі дам першы ўрок,—пойдзем і запішамся. Добра?

На небе, за іх спінамі, падае зорка.



ПАРТРЭТЫ СУЧАСНІКАЎ

Увесь даволі прасторны пакой застаўлены падрамнікамі, палотнамі, эцюдамі, фрагментамі. Некаторыя з фрагментаў добра знаёмы. Вось, напрыклад, постаць воіна, гарматны ствол танка, натоўп... Гэта з вядомай карціны «Мінск 3 ліпеня 1944 года». Вось яшчэ накіды... Побач з мальбертам — скрутак ватману, падрамнік з нацягнутым палатном. Нават пакладзена грунтоўка. На палатне яшчэ няма ніводнага мазка. Магчыма, мастак яшчэ толькі выношвае задуму новага твора.

Але пра тое, што ў планах, мастакі звычайна не гавораць. І мо таму Валянцін Віктаравіч Волкаў паказвае на партрэт:

— Вось гэта лётчык Аляксей Алялюхін, двойчы Герой Савецкага Саюза. Вельмі добры чалавек...

Калі прагледзець творчасць Валянціна Віктаравіча за апошнія гады, не цяжка заўважыць, што мастака ўвесь час прываблівае простыя людзі, іх будзённае жыццё, веліч савецкага чалавека, характар і прыгажосць яго душы, адвага, самаадданасць у працы.

Партрэт Алялюхіна мастак пачаў пісаць восенню мінулага года. Між іншым, словы «пачаў пісаць» трэба разумець не ў вузкім сэнсе — наносіць фарбы на палатно. Пачаў пісаць з прыватных гутарак з героем, у якім цікавіла ўсё: ці жанаты Алялюхін? Як жыве ён? Колькі варожых самалётаў збіў асабіста і колькі ў групавых баях? Валянцін Віктаравіч паехаў на аэрадром і, знайшоўшы ўтульнае месца, доўга сядзеў, назіраючы жыццё гаспадароў неба: як узлятаюць самалёты, як робяць пасадку, як праносяцца маланкай і знікаюць у паблёклым вераснёўскім блакіце. Потым крыху стомлены вяртаўся ў майстэрню і настойліва шукаў кампазицыю будучага твора. І вось цяпер перад намі партрэт. Лётчык, крыху ўзняўшы галаву, пільна ўглядаецца ў неба. Ён стаіць на полі. У далечыні — лес.

— Партрэт яшчэ не закончаны, — гаворыць Валянцін Віктаравіч. — Вясну чакаю. Растане снег, і зноў паеду на аэрадром. Але ж вы толькі падумайце: трыццаць самалётаў асабіста і семнаццаць у групавых баях!

Мастак маўчыць некалькі мінут і паказвае на другі партрэт. Чалавек у белым халаце. Валянцін Віктаравіч не спяшаючыся гаворыць:

— Хірург Лось. Харошы чалавек...

Мы ведаем, чаму ён харошы. Як кажуць, лёгкая рука хірурга не адно жыццё выратавала ад смерці. У знак вялікай удзячнасці тых, каму дапамог хірург, ад іх імя і стараўся гэты партрэт.

У гэтыя дні Валянцін Віктаравіч працуе над партрэтам Мікіты Сяргеевіча Хрушчова — мужнага барацьбіта за мір і дружбу народаў усяго свету. Гэта будзе літаграфія на камені.

Расказваючы аб партрэтах, Валянцін Віктаравіч узяў кісць і зноў падышоў да палатна, на якім намаляваны Алялюхін. У гэты момант яго і сфатаграфаваў наш карэспандэнт Ул. Крук.

І ПУБЛІЦЫСТ—МАСТАК

[Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.].

Зразумела, ніхто не патрабуе выкідваць лічбы і біяграфічныя звесткі з нарысаў і карэспандэнцый. І яны могуць мець там месца і рабіць сваю справу. Але гэта будзе толькі тады, калі нават і лічбы аўтар успрыме як цікаўны, заклапочаны чалавек, абдумае іх, засвоіць, а не проста занатуе ў запісную кніжку.

Часта на старонках часопіса «Маладосць» выступае С. Кухараў. Можна толькі пазайздросціць аператыўнасці і працаздольнасці С. Кухарава-журналіста: яго прозвішчам падпісаны і нарысы, і карэспандэнцыі, і рэпартажы, і нататкі. На жаль, яны пазбаўлены роздуму над фактамі, глыбіні ў паказе самага галоўнага — чалавека. С. Кухараў часцей спыняе сваю ўвагу на тым, што ляжыць на паверхні, што само ідзе ў рукі.

Вось нарыс «Парасткі будучыні» (№ 12)—пра калектыў камуністычнай працы цэха кантрольна-вымяральных прыбораў Магілёўскага завода штучнага валакна. Мы верым, што там працуюць цудоўныя людзі, але... не адчуваем гэтага ў нарысе. Героі яго ад першай да апошняй старонкі толькі і робяць, што **расказваюць**—то аўтару, то самім сабе—аб сваіх справах, працы, жыцці.

Такія ж несупынныя размовы і ў яго «Веснавых настроях» (З сельскага дзённіка) у № 5. Форма дзённіка давала магчымасць вопытнаму журналісту зрабіць нейкія вывады са сваіх назіранняў і ўражанняў, заўважыць і падкрэсліць тое новае, што з'явілася ў жыцці калгаснай вёскі ў апошні час, асабліва цяпер, пасля праяўленых партыяй вялікіх клопатаў аб развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці. Замест гэтага аўтар проста забаўляе чытача размовамі: спачатку са старшынёй калгаса К. Арлоўскім, затым з сакратаром парткома А. Нікіценкам, потым з загадчыкам фермы І. Шамедзькам, з даяркамі Надзяй і Галяй Бяляўскімі, свінаркай Хрысцінай Міхнёвай і г. д., і г. д.

З «Веснавымі настроямі» С. Кухарава вельмі блізка пераклікаецца «Прастор шырокі» (З блакнота пісьменніка) М. Хведаровіча (№ 6). Тут таксама такія ж бясконцыя гутаркі аўтара са старшынёй калгаса імя Леніна Капыльскага раёна І. Лаўруковічам (як і ў Кухарава, гутарка адбываецца ў будынку праўлення), з сакратаром парткома Чыжам, з загадчыкам свінафермы Ул. Карпучком, з брыгадзірам маладзёжнай брыгады Я. Адамовічам. Той жа прыём і тыя ж словы, што і ў Кухарава. Новыя толькі лічбы і прозвішчы. Праўда, ёсць і адрозненні. Пісьменнік М. Хведаровіч робіць у канцы «вельмі глыбокую» заўвагу аб тым, што моладзі калгаса варта было б прывесці ў належны стан закінутыя сажалкі і разводзіць у іх рыбу, як некалі рабіў гэта мясцовы пан Едка.

Павярхоўны і нарыс П. Шаўцова «Знойдзенае шчасце»—пра маладую свінарку калгаса «Запаветы Леніна» Крычаўскага раёна Зіну Гарохаву (№ 9). Тут прысутнічаюць усе ланцужкі вышэй прыведзенай схемы: першыя цяжкасці («Зіна Гарохава не адразу знайшла сваё прызначэнне», «Але Зіна і яе сяброўкі не скардзіліся на цяжкасці, бо ведалі, куды ішлі») і «светлыя, узнёслыя» заключныя радкі: «У Зіны ёсць свая мара.

— Каб стаць добрым заатэхнікам,—гаворыць яна, — трэба спачатку папрацаваць на ферме, на практыцы навучыцца гадаваць жывёлу. А потым і ў тэхнікум».

Інфармацыйны характар носіць вялікі нарыс П. Валкадаева «Куём да шчасця мы ключы» (№ 10). Праўда, сюжэтная схема тут крыху іншая, хоць, зноў-такі, далёка не новая. Старога каваля, ветэрана завода імя Кірава І. Ліпніцкага камсамольцы запрасілі на сход. Смелыя мары маладых узрушылі душу Ліпніцкага: «Аб чым жа ён марыў у дні свайго юнацтва?».

Іван Пятровіч—чалавек багатага і складанага жыццёвага шляху. Аўтар меў пад рукамі цікавейшы матэрыял, які даваў падставу і мажлівасць павесці глыбокую, цёплую, шчырую гаворку **пра чалавека.**

На жаль, гаворкі такой не атрымалася. Замест усхваляванага аўтарскага роздуму над велічным зместам нашага часу чытачу прапанавана сухая пратакольна-біяграфічная даведка: нарадзіўся ў беднай парабкоўскай сям'і, у маленстве бегаў пастушком, потым пашчаслівілася трапіць вучнем да каваля, пасля — партызанства ў гады грамадзянскай вайны, прыход у горад у майстэрню, выпуск першага станка, аднаўленне завода пасля вайны і г. д. Урэшце, і такую біяграфічную схему можна часткова апраўдаць, бо ўсё жыццё Івана Пятровіча Ліпніцкага неразрыўна звязана з гісторыяй завода. Але яна толькі тады была б дарэчы, калі б аўтар вёў расказ **пра чалавека, а не штучна прывязваў** вехі яго жыцця да паваротных вех росту прадпрыемства ад саматужнай майстэрні да вядомага далёка за межамі нашай краіны завода.

Інфармацыйнасць, дэкларацыйнасць часта ўласцівы і тым матэрыялам, якія часопіс друкуе ў раздзеле «Гары, камсамольскі аганёк».

Якуб Колас у артыкуле «Сучаснасць і пісьменнік» вельмі слушна пісаў: «Можна, напрыклад, добра апісаць, як быў выкапаны катлаван на будаўніцтве магутнай электрастанцыі. І што ж? Катлаван ёсць катлаван, вынік дзеянняў людзей і механізмаў, некаторая, няхай нават здзіўляючая, колькасць кубаметраў вынутага грунту. Дапусцім, што такому апісанню спадарожнічаюць верныя рысы ў абмалёўцы будаўнікоў, названы месца работы і гады яе выканання. Але твор усё-такі застанецца сумным пераказам падзей, наменклатурным пералікам асоб, калі працоўныя намаганні іх будуць паказаны як больш ці менш стараннае выкананне зададзенага ўрока. Без натхняючага пачуцця часу і перспектывы развіцця паказ рэчаіснасці акажацца прыземленым. Іншая справа, калі мастак створыць яркія вобразы, асветліць работу, выкананую працоўным калектывам, як адно з звенняў у ліку многіх здзяйсненняў савецкіх людзей, якія працуюць з усведамленнем канчатковай вялікай мэты сваёй працы».

Апошняга якраз і нестае многім матэрыялам з раздзела «Гары, камсамольскі аганёк». У выніку раздзел, які закліканы шырока і рознабакова асвятляць жыццё і справы нашай моладзі, застаецца ў часопісе, бадай, самым сумным, без таго аганька, які дакляраваны ў загалоўку.

Далёка не заўсёды радуюць і «чыста» публіцыстычныя выступленні часопіса. У дванаццаці нумарах яго за мінулы год змешчана каля дзесяці публіцыстычных артыкулаў (з іх два рэдакцыйныя, перадавыя), аднак не ўсе яны прысвечаны надзённым праблемам жыцця моладзі.

Мастацкая вартасць асобных артыкулаў (К. Патаенкі, І. Грамовіча, Я. Бабосава, Г. Навіцкага і іншых) невысокая. Чытач не адчувае ў іх непасрэднага аўтарскага даследавання фактаў і з'яў жыцця.

Звернемся да артыкула К. Патаенкі «Хто не працуе, той не есць» (№ 1). Аўтар узнімае хвалюючае пытанне барацьбы з дармаедствам, утрыманцтвам. Гаворку пра нецярпімасць да розных праяў дармаедства К. Патаенка пачынае з вядомага палажэння аб тым, што праца стварыла чалавека. Затым ідзе аналіз працоўнай дзейнасці людзей у феадальным і капіталістычным грамадстве, і толькі потым раскрываецца змест працы нашага, савецкага чалавека. Нарэшце, у канцы артыкула аўтар называе некалькі прозвішчаў юнакоў, якія не хочуць працаваць. А самага галоўнага — палкага абурэння, якое выклікае ў нашага сучасніка шкодная і нецярпімая з'ява,—няма!

Некалькі слоў пра раздзел «Навука і культура». Раздзел гэты ў часопісе даволі разнастайны па тэматыцы і багата ілюстраваны. Але заўважаецца, што выбар тэм носіць выпадковы характар. На працягу года «Маладосць» змясціла шэраг артыкулаў: Г. Барташэвіч — «Выдатны беларускі вучоны» (Да стагоддзя з дня нараджэння Я. Ф. Карскага), С. Бобава — —«Загадкі Венеры адгадваюцца», В. Говара — «Заўтрашні дзень будаўніцтва», А. Гусака —«Прыгажосць матэматыкі», В. Камарова — «Ці населены сусвет?», Б. Розена — «Народжаныя газам» і іншыя. Як бачна, часопіс часта асвятляе пытанні навукі, аднак не вядзе глыбокай і змястоўнай гутаркі аб навейшых дасягненнях айчыннай навукі, аб тых праблемах, якія хвалююць савецкіх і замежных вучоных.

Аднастайна і сумнавата асвятляюцца пытанні развіцця нашага мастацтва, выхавання густаў нашай моладзі. Пераважнай, калі не адзінай формай матэрыялаў тут з'яўляецца рэпартаж з залаў выставак, аглядаў і конкурсаў. У дванаццаці нумарах часопіса з'явілася толькі два больш-менш сур'ёзныя артыкулы: «Зойдзем у палац музыкі» Д. Жураўлёва (№ 5) і «Наш купалаўскі» Ул. Стэльмаха (№ 2).

Часопіс «Маладосць» адрасаваны моладзі. На жаль, матэрыялаў, якія б закраналі надзённыя пытанні жыцця нашай моладзі, у ім пакуль што недастаткова. Маральны кодэкс будаўніка камунізма, выхаванне чалавека будучыні, выбар жыццёвага шляху сённяшнімі дзесяцікласнікамі, клопаты і хваляванні маладога спецыяліста, вызваленне чалавека ад агідных напластаванняў мінулага — усё гэта хвалюе сёння нашу моладзь, і варта ўвагі часопіса, заслугоўвае самай страснай і шчырай гаворкі.

Для гэтага ёсць адзіны кірунак—быць бліжэй да жыцця, умець заўважыць і адчуць тое, што нараджаецца ў барацьбе савецкага народа за камуністычнае грамадства. І расказваць пра гэта трэба ярка, усхвалявана, па-мастацку.

М. ГІЛЕВІЧ.

Врытанскі каланіялізм чапляецца за свае старыя пазіцыі. Для панавання над народамі Бліжняга Усходу ён пачаў новую авантуру — выцягнуў на свет старую прынаду: «Саюз дабратворнага паўмесяца».

З газет.



НА СТАРЫ КРУЧОК...

Мал. **М. ЖЫТНІЦКАГА.**

ПАШТАЛЬЁН ЗАЙШОЎ У МАГАЗІН...

Па вуліцы Адама Міцкевіча ў Нясвіжы знаходзіцца кніжны магазін. Сярод яго наведвальнікаў часта можна ўбачыць старшыню калгаса «Першае мая» М. Шулякоўскага. Ён — падпісчык на поўнае выданне твораў Ул. І. Леніна, на Малую савецкую энцыклапедыю. У ліку актыўных пакупнікоў—агароднік калгаса «17 верасня» Ю. Абрамовіч, сталяр райпрамкамбіната Э. Сяляўка, рабочыя Гарадзейскага пункта хлебапрадуктаў А. Скачко, М. Маскалік, А. Шнаркевіч. 15 падпісчыкаў атрымліваюць тамы поўнага выдання твораў Ул. І. Леніна.

Загадчык кнігарні Валянцін Макараў своечасова дае заяўкі на новую літаратуру. Не праміне Валянцін Васільевіч і выпадку, каб сказаць таму ці іншаму пакупніку, што магазін атрымаў новую літаратуру. І аматары кнігі з прыемнасцю папаўняюць свае асабістыя бібліятэчкі. За мінулы год прададзена кніг на 65 тысяч рублёў, план выканан больш чым на 130 працэнтаў. За дасягнутыя поспехі Мінскі абком прафсаюза работнікаў культуры ўзнагародзіў тав. Макарава Ганаровай граматай.

...Паштальён зайшоў у магазін і перадаў некалькі пісем. Жыхар горада Яраслаўля Мікалай Фёдаравіч Сядлоў паведамляе, што атрымаў чарговую пасылку «Кніга—поштай» і просіць выслаць яшчэ адну. У яго адрас высланы кнігі — «Па воўчых сцежках» М. Паслядовіча, «Расстаёмся ненадоўга» А. Кулакоўскага і іншыя. Задаволена таксама просьба Уладзіміра Бялова з Яраслаўля. Яму паслалі пасылку, у якой раман А. Адамовіча «Вайна пад стрэхамі», «Глыбокая плынь» І. Шамякіна.

За мінулы год у адрас кнігарні прыйшло звыш чатырох тысяч пісьмаў. Магазін выслаў каля трох тысяч пасылак «Кніга—поштай».

І. ТАРТОЎСКІ.

У прэзідыуме і партбюро СП БССР

Адбылося пасяджэнне прэзідыума і партбюро Саюза пісьменнікаў Беларусі, на якім быў абмеркаваны артыкул А. Клышко «Не кажы гоц», які быў надрукаваны ў газеце «Літаратура і мастацтва» ад 26 снежня мінулага года. У ходзе абмеркавання высветлілася, што верш Т. Табідзе трапіў у зборнік Міколы Хведаровіча па недагляду рэдакцыі, аднак вінаваты аўтар у тым, што няўважліва прачытаў карэктуру. Што датычыцца падабенства верша «Крыжачок» Міколы Хведаровіча да верша «Сядзіць цвыркун на прыпечку» Станіслава Шушкевіча, то ўстаноўлена, што абодва паэты апрацавалі народную песню, якая бытуе ў многіх раёнах рэспублікі.

З гісторыі беларускай культуры

НОВАЕ АБ «НАШАЙ ДОЛІ»

«Наша доля» і «Наша ніва» былі першымі легальнымі беларускімі газетамі. Яны з'явіліся вынікам хоць і незначнай, але ўсё-такі перамогі, якую здабыў сабе беларускі народ, разам з народамі ўсёй царскай Расіі выступіўшы ў 1905 годзе на барацьбу за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне.

Царскі ўрад быў так напалоханы рэвалюцыяй, што вымушаны быў пайсці на нейкія ўступкі, у тым ліку і на дазвол выданняў на беларускай мове. Іншая справа,—выданні былі пастаўлены ў такія ўмовы, што не маглі адкрыта выказваць свае думкі, не маглі ажыццяўляць сваёй праграмы. За кожнае не пажаданае для самадзяржаўя выступленне на газеты накладваліся арышты, канфіскоўваліся нумары. Вельмі кароткім быў век «Нашай долі».

Аб ролі гэтых газет, аб іх значэнні для развіцця грамадскай думкі на Беларусі, для развіцця беларускай літаратуры пісалася многа. У тым, што пісалася, было многа спрэчнага, а часам і няправільнага.

Пытанне гэта вельмі складанае і вырашыць яго ў адным артыкуле немагчыма. Аўтару гэтага артыкула хацелася б на фактычным матэрыяле павесці размову аб «Нашай долі», роля і значэнне якой, на нашу думку, таксама яшчэ не высветлены да канца. З'яўляюцца, на нашу думку, цікавымі і новыя архіўныя матэрыялы аб судовым праследаванні «Нашай долі», якія да гэтага часу нідзе не публікаваліся (архіўныя дакументы, якія ніжэй прыводзім, адносяцца да 1906 г.).

У Ленінградскім дзяржаўным гістарычным архіве захавалася дакладная запіска віленскага губернатара ў Галоўнае ўпраўленне па справах друку аб дазволе на выданне першай беларускай газеты:

«12 жніўня за № 11532 мною выдана пражываючаму ў г. Вільне мешчаніну Івану Адамавічу Тукеркесу пасведчанне на права выдання ім у гор. Вільне пад асабістую адказнасць і рэдагаванне штотыднёвага часопіса на беларускім нарэччы «Наша доля» па наступнай праграме: 1) Дзеянні ўрада, 2) Палітычны агляд, 3) Жыццё вёскі, 4) Жыццё гарадоў, 5) Фельетоны, 6) Навейшыя творы беларускай літаратуры, 7) Што чуваць на Белай Русі, 8) З Літвы, 9) Па Расіі, 10) Карэспандэнцыя, 11) З заграніцы, 12) Што трэба і чаго не трэба чытаць, 13) Літаратурныя прыдумкі, 14) Новыя кнігі, 15) З мінулага Беларусі, 16) Паштовая скрынка, 17) Сельская гаспадарка, 18) Практычная медыцына, 19) Прыкладная механіка, 20) Сумесь і 21) Аб'явы.

Падпісная плата за часопіс устанаўліваецца 3 рублі ў год з дастаўкай і перасылкай, цана асобнага нумара 5 кап. Друкавацца выданне будзе рускімі і лацінскімі літарамі ў друкарні Навіцкага». *)

Як відаць, праграма была шырокая і жыццё газеты было разлічана надоўга. «Нашай долі» дазвалялася пісаць аб дзеяннях урада, рабіць палітычны агляд, пісаць пра жыццё вёскі і горада, змяшчаць фельетоны і г. д.

Вядома, што рабіць усё гэта можна было па-рознаму. І вядома, што самадзяржаўе было зацікаўлена ў тым, каб газета асвятляла гэтыя пытанні з патрэбных яму пазіцый. Аднак з першага ж нумара газета ўзяла адкрыты рэвалюцыйна-дэмакратычны напрамак.

Газета адкрыта заявіла аб сваіх класавых сімпатыях і антыпатыях. Яна ўголас аб'явіла, што будзе падтрымліваць тых, хто ў рэвалюцыйным змаганні хоча здабыць сабе свабоду. У звароце «Да чытацеляў», які быў змешчаны ў першым нумары газеты, «Наша доля» пісала:

«У дзісейшы вялікі момант, калі ўсе народы гасударства Расейскага, аб'явіўшы вайну старым парадкам, напрагаюць усе свае сілы, каб дабіцца свабоды і лепшае долі, мы будзем разам з імі».

«Наша доля» бачыла класавае размежаванне беларускага народа. Яна ўголас гаварыла аб тым, што ў беларускім грамадска-палітычным руху няма адзінай плыні, і што яна будзе бараніць толькі інтарэсы працоўнай беднаты. «Наша доля» як раней, так і цяпер будзе бараніць справы мужыцкае і ўсёй працавітай беднаты», — пісала газета ў № 5.

Указваючы на класавы падзел беларускага грамадства, «Наша доля» заяўляла, што не бог падзяліў людзей на багатых і бедных. Класы — катэгорыя гістарычная. Створаныя чалавекам, яны і загінуць ад рукі чалавека. «Наша доля» клікала працоўны народ на барацьбу з ладам, пабудаваным на эксплуатацыі аднаго класа другім. Прытым газета ўказвала на неабходнасць у гэтай барацьбе саюза рабочага класа і сялянства.

«Мы на пачатку ўжо сказалі, — пісала газета, — што цяпер на свеце такі парадак, пры каторым заўсяды будуць багачы і бедныя, і адны людзі будуць жыць з цяжкай працы другіх, самі нічога не робячы. Але гэты парадак не вечны: зрабіў яго не бог, а людзі, і людзі самі пераменяць у ём усё злое. Толькі трэба ведаць, што зрабіць гэту перамену зможа толькі ўвесь рабочы народ, уся вясковая і меставая беднота, калі ўсе разам пойдуць па адной дарозе. Дзеля таго ўсе мужыцкія саюзы павінны злучыцца праз свае камітэты з рабочымі саюзамі і партыямі ў горадзе».

Заклікаючы ўвесь працоўны народ гуртаваць свае сілы, «Наша доля» накіроўвала аб'яднаныя сілы народа на рэвалюцыйную барацьбу, на ўзброенае паўстанне. Газета растлумачвала народу, што нельга чакаць свабоды ад цара, а трэба вырваць яе сілаю. У артыкуле «Што будзе?», змешчаным у № 1, «Наша доля» пісала:

«Усім вядома, што для ўспакаення народа, каторы ішоў сілаю здабываць зямлю і свабоду, правіцельства аб'явіла, што яно хоча перамяніць старыя парадкі і дзеля таго склікае Гасударственную думу.

Правіцельства разагнала Думу. Яно гэтым ясна паказала, што не дасць народу ні зямлі, ні праўдзівае свабоды.

І народ зразумеў гэта. Зразумеў ён, што пасля разгону Думы засталося яму адно з двух: або так як даўней прападаць з голаду, або самому памысліць аб сваёй долі. І ён выступіў на бой за шчасце ўсёй працавітай беднаты.

Цяпер бунтаўшчык — увесь стомлённы, галодны народ. Правіцельства кроўю заліло цэлы край і думала гэтым успакоіць народ, але штыкамі і кулямі можна прыдушыць народ, можна з усёй Расіі зрабіць адну вялікую магілу, а не ўпраўляць жывымі людзьмі. Кроў забітых братоў трудна забыць; слёзы іх удоў і сірот не даюць спакою ні ўдзень, ні ўночы».

У артыкуле «Што будзе?» і «Як мужыку палепшыць сваё жыццё», цытаты з якіх прыводзіліся вышэй, «Наша доля» заклікала працоўных на ўзброенае паўстанне, у якім народ павінен быў здабыць сабе зямлю і волю.

Узброенае паўстанне пераможа толькі тады, — гаварыла «Наша доля», — калі ўсё сялянства выступіць на барацьбу ў саюзе з пралетарыятам.

Пракурор Віленскай судовай палаты ў «Справе» рэдактара «Нашай долі» абвінавачваў газету ў першую чаргу іменна за прапаганду ўзброенага паўстання, рухаючымі сіламі якога, на думку газеты, павінна быць сялянства ў цесным саюзе з пралетарыятам. У «Справе» аб рэдактары газеты «Наша доля» гаворыцца, што газета ў артыкуле «Што будзе?» «...заклікае да ўзброенага паўстання для змены дзяржаўнага ладу перадачаю ўлады ў рукі народных прадстаўнікоў, выбраных на аснове ўсеагульнага, прамога, роўнага і тайнага галасавання», а ў артыкуле «Як мужыку палепшыць сваё жыццё» «...беззямельныя і малазямельныя сяляне, чыншавікі і арандатары заклікаюцца арганізоўвацца ў саюзы, якія будуць вялікаю сілаю ў барацьбе з багацеямі за шчасце ўсяго рабочага народа, і затым, злучыўшыся з гарадскім рабочым пралетарыятам, агульнымі сіламі змяніць існуючы зараз створаны «не богам, а людзьмі» парадак грамадскага ладу, пры якім заўсёды будуць «і багацеі і бедныя» і адны людзі будуць жыць ад цяжкой работы другіх, самі нічога не робячы». *)

Безумоўна, што газета рэвалюцыйна-дэмакратычнага напрамку, якою выявіла сябе «Наша доля», супярэчыла патрабаванням, якія ставіла самадзяржаўе да перыядычнага друку, і «Наша доля» вельмі хутка адчула гэта. Ужо на першы нумар газеты быў накладзены арышт, тыраж канфіскаваны, а выдавец прыцягнуты да крымінальнай адказнасці. Віленскі інспектар па справах друку дакладваў у Галоўнае ўпраўленне па справах друку:

«Упраўляючы канцылярыяй Віленскага, Ковенскага і Гродненскага Генерал-губернатара адносінай ад 2-га бягучага верасня за № 5328 па даручэнню п. Галоўнага начальніка краю прасіў узбудзіць судовае праследаванне з канфіскацыяй належных экземпляраў № 1-га газеты, якая выдаецца ў Вільні на беларускім нарэччы пад назваю «Наша доля» за надрукаванне ў гэтым нумары артыкула пад загалоўкам «Што будзе?», які заключае ў сабе прызнакі злачын., прадугледжан. пп. 1 і 3 арт. 129 крымінальнага ўлажэння і заметкі пад загалоўкам «Даход расійскага цара» як парушаючай патрабаванні артыкулаў 73 стат. аб цэнз. і друку.

Для выканання адзначанай прапановы было зроблена неадкладнае распараджэнне аб канфіскацыі адзначанага нумара названай газеты і адначасова ўзбуджэння крымінальнага праследавання супраць рэдактара — выдаўца гэтай газеты Івана Тукеркеса».*)

Але ні канфіскацыя нумара, ні праследаванне газеты не прымусілі «Нашу долю» змяніць свой кірунак. У наступных нумарах газета працягвала трымацца рэвалюцыйна-дэмакратычнага напрамку. «Наша доля» па-ранейшаму клікала рабочых і сялян на ўзброеную барацьбу, супраць сваіх «ворагаў і грабіцеляў».

Газета выступала супраць нацыянальнай абмежаванасці, за саюз у рэвалюцыйнай барацьбе працоўных усіх нацый. «Чы праваслаўны, чы католік, чы жыд, чы рускі, чы паляк, чы літвін, чы латыш, чы немец, чы татарын, чы армянін, чы калмык і шмат яшчэ другіх, каторыя жывуць у цэлым нашым вялікім гасударстве... ўсё гэта браты нашы па нядолі.

Дык вот жэш і трымайцеся разам, не заводзьце адзін з другім сварак, выкіньце з свайго сэрца тую нянавісць адзін да другога, каторую нашы ворагі ў вас засяваюць, каб вы ў гэтай братаўбійственнай вайне патрацілі свае сілы і не маглі ваяваць з праўдзівымі вашымі ворагамі і грабіцелямі»,—пісала «Наша доля» ў № 5.

Даводзячы неабходнасць рэвалюцыйнай барацьбы, «Наша доля» падрывала веру народа ў тое, што дума дасць сялянам зямлю і волю. У № 5 «Нашай долі» ў артыкуле «Кандыдаты ад Вільні» гаворыцца:

«Ад Вільні знайшліся два кандыдаты ў Думу—ксёндз Станіслаў Мацеевіч і пан Юзэф Монтвіл.

Як жа не паверыць такім вельмі паважаным людзям?

А мы, хоць, можа, гэта і вялікі грэх,—не верым ім. Не верым ім дзеля таго, што справы паноў і ксяндзоў не тыя, што нашы. Не верым мы, каб павук калі-небудзь пажалеў муху. У гэтых двох кандыдатаў ёсць шмат агульнага: у барацьбе з людзьмі, каторыя мысляць іначай, яны, як адзін, так другі, гатовы прыбегнуць да самых брудных спосабаў і штук».

«Наша доля» з нянавісцю абрушылася на сілы рэакцыі, якія ў канцы 1906 года пачалі ўзнімаць свае галовы

«З грозных нораў выпаўзлі... брыдкія гады. Цяпер яны горда паднялі галовы. Цяпер яны пачулі сваю сілу, калі жменя грабіцеляў, маючы камандзіра ў Сталыпіне, заліваець кроўю ўсё агромнае гасударства, хочучы патапіць у крыві вялікі асвабадзіцельны рух. З радасцю прыслухоўваюцца яны да залпаў, ад каторых гінуць сотні сыноў свабоды, з уцехаю даведваюцца аб частых смяртэльных прыгаворах ваенна-палявых судоў—гэтай насмешкі над правасуддзем».

Сілы рэакцыі, якія кляйміла «Наша доля», задушылі і першую беларускую легальную газету. Выйшла толькі шэсць нумароў «Нашай долі». За час выхаду ў свет гэтых шасці нумароў тыражы газеты неаднаразова канфіскоўваліся. Арышт накладваўся не толькі на першы, але і на 3, 4, 5, 6 нумары. Пасля канфіскацыі шостага нумара віленскі губернатар дакладваў у Галоўнае ўпраўленне па справах друку:

«Пракурор Віленскай судовай палаты адносінаю ад 12 бягучага студзеня за № 127 паведаміў мне, што Віленская судовая палата, разгледзеўшы ў судовым пасяджэнні 11 гэтага студзеня справу аб рэдактары-выдаўцы газеты «Наша доля», якая выдаецца ў гор. Вільне на беларускай мове, Іване Адамавічы Тукеркесе, які абвінавачваецца па 1 і 2 п. 129 арт. крым. улаж. і 6 арт. 8 аддз. часовых правіл аб пачасовых выданнях 24 лістапада 1905 г. прыгаварыла: падсуднага рэдактара-выдаўца газеты «Наша доля», мешчаніна г. Вільна Івана Адамавіча Тукеркеса 25 гадоў заключыць у крэпасць на адзін год, з забаронаю яму прымаць на сябе званне рэдактара або выдаўца якога б то ні было пачасовага выдання на працягу трох год, самое ж выданне газеты «Наша доля» спыніць назаўсёды». *)

Нягледзячы на тое, што «Наша доля» праіснавала нядоўга, яна адыграла немалую ролю ў справе рэвалюцыянізацыі беларускага народа. Гэта была першая газета, якая загаварыла з селянінам на яго роднай мове і загаварыла аб тым, што больш за ўсё яго хвалявала. «Наша доля» трапляла ў самыя глухія куткі Беларусі, расказвала там аб падзеях, якія адбываюцца ў Расіі і клікала народ самых глухіх куткоў Беларусі далучыцца да рэвалюцыйнай барацьбы.

На старонках «Нашай долі» ўпершыню пачаў друкавацца вялікі беларускі паэт Якуб Колас. У першым нумары «Нашай долі» быў надрукаваны першы верш Якуба Коласа «Наш родны край». У № 3 быў надрукаваны верш Якуба Коласа «Беларусам», які з'явіўся адной з прычын канфіскацыі трэцяга нумара «Нашай долі».

Паэтэса-рэвалюцыянерка Цётка сама прымала актыўны ўдзел у выданні газеты, была яе супрацоўніцай. Яна надрукавала там свой вядомы твор «Прысяга над крывавымі разорамі», верш «Наш палетак» і палітычны фельетон «Разумныя, ды не на дурня напалі».

Такім чынам, «Наша доля» пакінула след і ў гісторыі беларускай літаратуры.

Л. АРАБЕЙ.

* ЦДА ЛССР, фонд Віленскай судовай палаты, вопіс 1, справа 3720, стар. 57.

* ЦДГА гор. Ленінграда, ф. 776, вопіс 22, справа 334, стар. 5.

* ЦДГА гор. Ленінграда, ф. 776, вопіс 22, справа 344, стар. 3.

* ЦДГА гор. Ленінграда, ф. 776, вопіс 22, справа 344, стар. 8.

Падзеі. Факты. Навіны

□ У доме адпачынку «Беларусь» адбыліся музычныя лекцыі-канцэрты на тэмы — «Нам песня жыць і будаваць памагае» і «Руская народная песня». Лекцыі чытаў музыказнаўца М. Жухавіцкі. Песні савецкіх аўтараў — І. Роньжына, В. Салаўёва-Сядога, Л. Лядавай, А. Пахмутавай, Ул. Алоўнікава, Э. Калманоўскага, рускія народныя песні выканалі артысты М. Пушкароў, А. Болатаў, Ю. Дзяргун, Ю. Матраеў, М. Марозава.

□ З вялікім поспехам выступіў у сталіцы Літвы малады беларускі спявак В. Чарнабаеў. Ён прыняў удзел у спектаклі Вільнюскага тэатра оперы і балета. У оперы Ш. Гуно «Фаўст» выканаў партыю Мефістофеля. Працоўныя Вільнюса цёпла віталі госця з Мінска.

□ У оперы А. Даргамыжскага «Русалка», пастаўленай у Беларускім дзяржаўным ордэна Леніна Вялікім тэатры оперы і балета з вялікім поспехам выступіў саліст Адэскай оперы А. Іваноў, які выканаў партыю Млынара. У гэтым жа спектаклі прынялі ўдзел два новыя артысты: партыю Князя спяваў малады саліст тэатра В. Гур'еў, партыю Вольгі — Л. Барысава.

□ Плённа працуюць самадзейныя кампазітары рэспублікі. За апошні час яны стварылі рад песень, напісаных на тэксты беларускіх паэтаў. Гэта, у асноўным, песні аб роднай Камуністычнай партыі, пра савецкага чалавека—будаўніка камунізма.

Самадзейныя кампазітары В. Гарбатоўскі і Э. Казачкоў свае творы прысвяцілі стваральніку Савецкай улады Ул. І. Леніну. «Дачка Беларусі» — так называецца другая песня, якую напісаў аб Веры Харужай Э. Казачкоў. Многія кампазітары ствараюць песні, якія ўслаўляюць прыгажосць роднага краю, радасную свабодную працу. Вось некаторыя з іх: «Край наш мілы» Н. Бяспалава, «Выйдзі, выйдзі, дзяўчына» П. Касача, «У лузе над рэчкаю» П. Шыдлоўскага, «Край палескі» Я. Ціхановіча і многія іншыя.

СТУДЗЕНЬ

Фотаэцюд **В. БАРАНОЎСКАГА.**

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, В. Ул. ІВАШЫН, А. Н. МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), П. Ф. ПРЫХОДЗЬКА, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), М. Г. ТКАЧОЎ, І. З. ШАРАХОЎСКІ, І. Б. ШАЦІЛА, Р. Р. ШЫРМА.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск. АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная сакратара—3-25-25, аддзела літаратуры—3-22-04, аддзела мастацтва—рэдакцыі—3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-24-62, аддзела культуры—3-20-54, выдавецтва—3-19-52, 3-25-25, адказнага бухгалтэрыі—3-11-03. «Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у аўторак і пятніцу

АТ 10629

Друкарня выдавецтва «Звязда».